ARCHE ARCHE 3’08

1. Зьмест / Уводзіны
2. Форум
3. Джордж Дура. Беларусь і Эўрапейскі Зьвяз: адкладзенае партнэрства
4. Рашэд Чоудхуры. Барак Абама й новая амэрыканская мара
5. Уладзімер Мацкевіч. Рэформа адукацыі: апаратная гульня і прафанацыя ведаў
6. Ігар Марзалюк. Сімптомы «пажаданай гісторыі»
7. Алесь Смалянчук. Дыскусія пра вытокі на фоне «ідэалагічнай рэвалюцыі»
8. Васіль Аўраменка. Новыя межы: чыіх рук справа?
9. Андрэй Вашкевіч. Андрэй Чарнякевіч. 25 сакавіка: вытокі нацыянальнага свята
10. Майкл Урбан. Алгебра савецкай улады
11. Андрэй Мірашнічэнка. Паўтарэньне шляху інструмэнтальнага розуму
12. Гедымінас Ланкаўскас. Прыбалтыка: гістарычная арэна каланіялізму?

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 3 (66) - 2008**

[image]

[image]

[image]

3[image]'[image]**2008**

аналітыка • эсэістыка • крытыка • палеміка • гісторыя • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

Зьмест

Contents

АНАЛІТЫКА

ДЖОРДЖ ДУРА Беларусь і Эўрапейскі Зьвяз: адкладзенае партнэрства

ЭСЭІСТЫКА

РАШЭД ЧОУДХУРЫ Барак Абама й новая амэрыканская мара

КРЫТЫКА

УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ Рэформа адукацыі: апаратная гульня і прафанацыя ведаў

ПАЛЕМІКА

ІГАР МАРЗАЛЮК Сымптомы «пажаданай гісторыі»
АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК Дыскусія пра вытокі на фоне «ідэалягічнай рэвалюцыі»
ВАСІЛЬ АЎРАМЕНКА Новыя межы: чыіх рук справа?

ГІСТОРЫЯ

АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ, АНДРЭЙ ЧАРНЯКЕВІЧ 25 сакавіка: вытокі нацыянальнага сьвята
МАЙКЛ УРБАН Альгебра савецкай улады. Цыркуляцыя эліт у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы (1966—1986)

РЭЦЭНЗІІ

АНДРЭЙ МІРАШНІЧЭНКА Паўтарэньне шляху інструмэнтальнага розуму
ГЕДЫМІНАС ЛАНКАЎСКАС Прыбалтыка: гістарычная арэна каляніялізму?

[image]
[image]

№ 3 (66) - 2008
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне [**mk**], Абнаўленьне [**czyk**]
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне на старонцы: 2008/07/20
[image]

Critical Error

Could not connect to the database

Джордж Дура

Болей за дзесяцігодзьдзе ЭЗ пастаянна прымаў дэклярацыі і рэзалюцыі па Беларусі, заклікаючы да неадкладнага правядзеньня дэмакратычных рэформаў, свабодных выбараў, павагі да асноўных правоў чалавека, свабоды СМІ і друку. Дарма што гандаль у апошнія гады стала ўзрастаў[2], ён заставаўся ніжэй свайго патэнцыялу, а фінансавая дапамога ЭЗ за пэрыяд 1991—2005 гг. склала агулам усяго 221 мільён эўра[3]. ЭЗ перанакіраваў дапамогу пераважна на праекты, якія мелі за мэту прасоўваньне дэмакратызацыі, сацыяльна скіраваныя праекты альбо праекты, накіраваныя на пераадоленьне наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

ЭЗ гэтаксама прыняў супраць Беларусі шэраг карных мераў ды санкцыяў, імкнучыся пры тым пазьбегнуць непасрэднай шкоды для насельніцтва. Яны былі распачатыя рашэньнем замарозіць ППС і Часовага пагадненьня аб гандлі ў 1996 г. ды спынець палітычныя кантакты на высокім узроўні зь Беларусьсю. Эўрапейскі парлямэнт вырашыў таксама ўстрымацца ад зацьвярджэньня любых двухбаковых пагадненьняў з Беларусьсю. Пасьля змадэляваных прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі ў 2001 г. ЭЗ увёў забарону на выдачу візаў беларускаму кіраўніцтву. Гэта забарона перазацьвярджаецца штогод і на сучасны момант тычыцца 35 асобаў уключна з судзьдзямі ды пракурорамі, адказнымі за суровыя прысуды для апазыцыянэраў. Акрамя таго, двухбаковыя кантакты на высокім узроўні, у тым ліку і на міністэрскім, замарожаныя. Такія санкцыі, як і ўвядзеньне эўрапейскіх інвэстыцыяў у Беларусь, былі ўведзеныя ў 2004 г. ды ў 2006 г. Яны ахопліваюць 33 асобы, якія, на думку ЭЗ, адказныя за фальсыфікацыю выбараў 2006 г. і за гвалт супраць дэманстрантаў. Акрамя таго, 5 кампаній, якія кантралююцца зь мінскага боку, замарожаныя. Агулам гаксамы аб'ём інвэстыцыяў у Беларусь у 2007 г. ацэньваўся ў 8,7 мільярда эўра[4].

Устанаўленая ў 1990 г. Сыстэма прэфэрэнцыяў (УСП) ЭЗ пасьля таго, як

---

1 Гл. Council of the European Union, «Wider Europe — Neighbourhood: A new framework for relations with our Eastern and Southern Neighbours», 11 March 2003 (PDF); а таксама European Commission, Strategy Paper on the European Neighbourhood Policy, 12 May 2004 (PDF).

2 Гл. Statistical Annex to Report from the Commission to the Council and the European Parliament on EU Assistance to Belarus, 2007 (PDF).

3 Гл. Report from the Commission to the Council and the European Parliament on EU Assistance to Belarus, 2007 (PDF).

4 Гл. Report from the Commission to the Council and the European Parliament on EU Assistance to Belarus, 2007 (PDF).

Міжнародная арганізацыя працы выказала заклапочанасьць абмежаваньнем правоў прафсаюзаў у краіне. Беларусь мае таксама адзін з найбольш суровых гандлёвых рэжымаў з ЭЗ у тэкстыльнай галіне. Іншыя партнэры ЭЗ, такія як ЗША і Канада, сьледам за ЭЗ увялі візавыя абмежаваньні ды таксама замарозілі актывы беларускага кіраўніцтва.

ЭЗ паўторна заклікаў Беларусь да дэмакратызацыі ў сьнежні 2006 г., калі Эўрапейская Камісія апублікавала неафіцыйны дакумэнт[4], адрасаваны народу Беларусі (відавочна, збэсьціўшы беларускае кіраўніцтва), у якім абяцаюцца палёгкі ў візавых пытаньнях, павелічэньне гандлю ды інвэстыцыяў, супрацоўніцтва ў шэрагу галінаў (экалёгія, транспарт і энэргетыка), культурныя і адукацыйныя абмены ды г. д. узамен за шэраг мераў па дэмакратызацыі, якія павінны правесьці беларускія ўлады (глядзі дадатак 1). У гэтым дакумэнце ЭЗ тлумачыць насельніцтву Беларусі, што іх краіна ня зможа далучыцца да ЭПС і карыстацца перавагамі цясьнейшых сувязяў з ЭЗ, пакуль іх улады не пакончаць з самаізаляцыяй, перайшоўшы да працэсу дэмакратычных рэформаў. ЭЗ абавязваецца таксама працягваць падтрымку незалежных праграмаў ТБ і радыё для Беларусі ды падтрымліваць студэнтаў, якія вучацца ў ЭЗ.

Неафіцыйны дакумэнт Камісіі азначаў важную маральную падтрымку беларускай апазыцыі, дадаючы элемэнт легітымнасьці ў яе супрацьстаяньні рэжыму Лукашэнкі. Ужо актывісты апазыцыі й агучвалі гэты дакумэнт на мітынгах і шэсьцях, аднак пакуль што, здаецца, гэты дакумэнт застаўся збольшага незаўважаным шырэйшымі коламі беларускага насельніцтва. Акрамя таго, беларускае кіраўніцтва не зьвярнула на яго ніякай увагі, што засьведчылі выбарчыя мясцовыя органы ўлады, праведзеныя некалькі тыдняў пасьля публікацыі неафіцыйнага дакумэнта ЭЗ у студзені 2007 г., якія не адпавядалі дэмакратычным стандартам і падчас якіх супраць апазыцыі былі ўжытыя неапраўданыя рэпрэсіі.

На працягу больш як дзесяцігодзьдзя двухкірункавы падыход ЭЗ чаргаваньня санкцыяў і гандлёвых абмежаваньняў з праграмамі дапамогі, накіраванымі пераважна на

4 Неафіцыйны дакумэнт Камісіі Эўрапейскі Саюз можа дапамагчы Беларусі, 5 сьнежня 2006 г., (PDF).

дэмакратызацыю, казаўся ня ў стане ўплываць на палітычную сытуацыю ў Беларусі: Лукашэнка застаецца пры ўладзе з высокім узроўнем падтрымкі сярод насельніцтва. Мэханізмы палітычнага й эканамічнага ўплыву ЭЗ у дачыненьні да Беларусі застаюцца абмежаванымі; выразная народная падтрымка ідэі членства Беларусі ў ЭЗ адсутнічае (падтрымка вагаецца каля 35%). Хаця неафіцыйны дакумэнт ЭЗ і шпурнуў мяч на поле беларускага кіраўніцтва, Беларусь ня выявіла найменшага інтарэсу ў далучэньні да ЭЗ альбо да яго палітыкі добрасуседзтва. Акрамя адсутнасьці афіцыйнага мэханізму для супрацоўнцтва зь Беларусьсю, мэта ЭЗ яшчэ болей ускладнілася гегемanісцкімі амбіцыямі (overbearing presence) Расеі, чый эксклюзывісцкі падыход да Беларусі не пакідае месца для *ménage a trois* з ЭЗ. Аднак з канца 2006 г. у палітыцы Расеі адбыліся пэўныя зьмены.

2. Зрухі ў палітыцы Расеі да Беларусі

Шмат гадоў Пуцін заклікаў спыніць расейскія субсыдыі ў беларускую эканоміку, пераважна ў выглядзе паставак газу й нафты па ільготных цэнах. Урэшце, беларускія ўлады паддаліся ціску Расеі/Газпрому і зацьвердзілі 31 сьнежня 2006 г. у апошні момант пратакол (падпісаны 18 траўня 2006 г.) аб пастаўках нафты й газу. Пагадненьне прадугледжвае набыцьцё Газпромам 50% Белтрансгазу, беларускай сеткі трубаправодаў, якія забясьпечваюць патрэбы Эўропы й айчынных спажыўцоў, за 2,5 мільярды амэрыканскіх даляраў. У ім таксама было зафіксаванае паступовае павышэньне цэнаў на газ, які Беларусь будзе атрымліваць ад Газпрому ў наступныя гады, аж да дасягненьня «эўрапейскай цаны» ў 2011 г. Са студзеня 2007 г. цана газу падскочыла з 46,68 $ да 100 $ за 1000 кубамэтраў, і, тым ня менш, застаецца вельмі нізкай у параўнаньні да сярэдняй цаны на эўрапейскім рынку ў 250 даляраў. У першым квартале 2008 года цана на газ узьнялася да 119 даляраў за 1000 кубамэтраў, а пазьней на працягу 2008 года чакаецца яе павышэньне да 150 даляраў. Апрача таго, расейскія нафтавыя кампаніі абавязаныя аплаціць мытную пошліну ў памеры 53 даляраў за тону пры экспарце сырой нафты ў Беларусь, тады як раней гэта рабілася на бяспошліннай падставе. Нарэшце,

Беларусь прымушана пераводзіць 70% падатковых збораў за перапрацоўку нафты ў Расею.

Апрача гэтага, Расея адмовілася ад плянаў пабудовы газаправоду Ямал-Эўропа-II, які б злучыў Расею з Эўропай праз Беларусь, нягледзячы на Лукашэнкава абяцаньне вызваліць на пяць гадоў ад аплаты за транзыт, калі Расея адмовіцца да ідэі аб трансбалтыйскім трубаправодзе «Паўночны паток». Да таго ж Газпром, які штогод пастаўляе 20 мільярдаў кубамэтраў прыроднага газу ў Беларусь, у жніўні 2007 году яшчэ раз выступіў з пагрозай зьнізіць пастаўкі газу Беларусі на 45% у сувязі з запазычанасьцю ў памеры 456 мільёнаў даляраў за пастаўкі газу ў першым паўгодзьдзі 2007 г.

Беларуска-расейскія дачыненьні зайшлі ў шмат глыбейшы тупік, чым энэргетычная сварка, і яго вытокаў трэба шукаць таксама ў кардынальна супрацьлеглых уяўленьнях у Лукашэнкі і Пуціна аб расейска-беларускай саюзнай дзяржаве. Пуцін адкрыта выступае за такую інтэграцыю, пры якой Беларусі будзе паглынутая ў саюзе, у якім Расея будзе мець дамінантнае становішча, фактычна ператварыўшы Беларусь у расейскую правінцыю, тым часам Лукашэнка не прымае нічога большага за неакрэсьленую канфэдэрацыю.

Ранейшыя нафтагазавыя субсыдыі Расеі дазвалялі беларускай эканоміцы красаваць, паказваючы ў сяэднім 10-працэнтныя тэмпы росту за тры гады з 2004 па 2006[5] ды тым самым павялічваючы падтрымку для Лукашэнкі ўнутры краіны. Разьлікі паказваюць, што ільготныя цэны на газ і адсутнасьць экспартных пошлінаў на карысьць Расеі на прадукты перапрацоўкі нафты давалі Беларусь каля 6 мільярдаў дадатковага даходу, ці прыблізна 13,5% гадавога ВНП краіны.

Пры новых умовах, прадыктаваных Масквой, «эканамічнае цуд» Лукашэнкі можа аказацца пад пытаньнем. Разьлікі паказваюць, што ў 2007 годзе дэфіцыт плацежнага балянсу, выкліканы нафтагазавым шокам, складзе 1,6 мільярдаў даляраў. Беларусь у кароткатэрміновай пэрспэктыве будзе нарошчваць залежнасьць ад тэхнічных крэдытаў, выдаваных (усё больш неахвотна) Расейскай Фэдэрацыяй дзеля пакрыцьця дэфіцыту бюджэту, аднак гэта можа падштурхнуць яе прыступіць да

[5] Пакаэзьнікі МВФ і афіцыйнай статыстыкі, зьвязаныя з тэмпамі росту ВВП, адрозьніваюцца ад 11,4% да

пэўных эканамічных рэформаў, дывэрсыфікаваць паставак і., 2004 г. энэрганосьбітаў, прыцягнуць замежны капітал і ганд, 3% у 2005 партнэраў з ЭЗ. Падчас нядаўняга візыту ў Славакію намесьнік міністра замежных спраў Валеры Варанецкі заявіў, што 10% у 2006 беларускі ўрад надае вялікую ўвагу разьвіццю спрыяльнага інвэстыцыйнага клімату шляхам лібэралізацыі ды эканамічнага супрацоўніцтва.

Хоць Беларусь была здольная ігнараваць відавочна слабыя гандлёвыя націскі, санкцыі і дэклярацыі аб парушэньнях правоў чалавека, а таксама заклікі да дэмакратызацыі, пагаршэньне яе дачыненьняў з Расеяй напрыканцы 2006 ды на працягу большай часткі 2007 году стварыла ўражаньне, што Беларусь цяпер можа паспрабаваць палепшыць свае дачыненьні з ЭЗ. Скандал з Расеяй з прычыны цэнаў на газ і нафту ў сьнежні 2006 — студзені 2007 гг. прымусіў Лукашэнку сьцішыць сваю антыэўрапейскую рыторыку. Са свайго боку, ЭЗ аказаўся больш схільным, чым раней, распачаць зь Беларусьсю дыялёг аб энэргіі, паколькі ў Брусэлі расьце заклапочанасьць магчымымі перабоямі ў пастаўках расейскіх энэрганосьбітаў, што ідуць у Эўропу транзытам празь Беларусь.

3. Лукашэнкава «новая зьнешняя палітыка»

Да нафтагазавай крызы ў Менску чуліся галасы, што стратэгічна ЭЗ ня можа прапанаваць Беларусі таго, што ёй можа прапанаваць яе ўсходняя суседка ў пляне цэнаў на газ, рынкаў, крэдытаў ды г. д. Са студзеня 2007 г. такі стан рэчаў адыйшоў у мінулае. Яшчэ зарана дакладна ацэньваць сацыяльныя і эканамічныя наступствы новай палітыкі Расеі да Беларусі, але краіна пачала як мага загадзя прымаць захады з мэтай прадухіленьня ўзьдзеяньня наступстваў энэргетычнай крызы. Беларусь увяла канцэпцыю «новай зьнешняй палітыкі» як спосаб пазначыць сваю незалежнасьць ад Расеі, якая ў існасьці грунтуецца на двух вымярэньнях: дывэрсыфікацыі паставак энэрганосьбітаў шляхам разьвіцьця больш цесных сувязяў з краінамі, багатымі на вуглевадародныя натуральныя рэсурсы, ды заняцьцем выразна праэўразьвязаўскай пазыцыі ў афіцыйных заявах, дамагаючыся больш цеснага супрацоўніцтва

з ЭЗ у некалькіх узаемавыгадных галінах, у прыватнасьці ў энэргетыцы.

Беларусь мае намер зьнізіць сваю энэргетычную залежнасьць ад Расеі. Яе кантакты на высокім узроўні на працягу 2007 г. з Вэнэсуэлай, Іранам, Азэрбайджанам, Нігерыяй, а таксама Нарвэгіяй (усе яны — найбуйнейшыя здабытчыкі нафты ці газу) можна разглядаць як спробу супрацьстаяць высакамернай энэргетычнай палітыцы Расеі, а таксама як жаданьне зьменшыць татальную залежнасьць Беларусі ад імпарту расейскіх энэрганосьбітаў. Каб дывэрсыфікаваць пастаўкі энэрганосьбітаў, Беларусь разглядае магчымасьць пабудовы ядзернай электрастанцыі, дарма што значная частка яе насельніцтва ўсё яшчэ церпіць ад наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Што датычыць гандлю, то беларуская эканоміка была традыцыйна зарыентаваная на выраб гатовай прадукцыі для былога савецкага рынку. Расея зьяўляецца першым па значнасьці гандлёвым партнэрам Беларусі, двухбаковы гандлёвы абарот дасягае 18 мільярдаў даляраў. Беларускія вырабы больш канкурэнтныя на рынках Расеі ды іншых краінаў СНД, чым на рынку ЭЗ. Мытны зьвяз паміж Расеяй і Беларусьсю — гэта дадатковая перашкода на шляху да пагадненьня аб вольным гандлі з ЭЗ, але ЭЗ-27 пераўзыходзіць Расею па аб'ёме беларускага экспарту (у 2006 г. 45,6% у ЭЗ у параўнаньні з 34,7% у Расею). Нягледзячы на гандлёвыя санкцыі ЭЗ й выключэньне Беларусі з АСП (Усеагульнай сыстэмы прэфэрэнцыяў), што цягне за сабой для Беларусі страту прыблізна ў памеры 400 мільёнаў эўра ў год, гандаль паміж Беларусьсю ды ЭЗ стабільна ўзрастае[6].

У якасьці часткі сваёй заяўленай «новай зьнешняй палітыкі» беларускае кіраўніцтва пачало шукаць паразуменьня з ЭЗ. У студзені 2007 г. Лукашэнка зрабіў экстравагантную заяву тым, што ён хутчэй увядзе эўра ды будзе намагацца ўступіць у ЭЗ, чым увядзе расейскі рубель ды ўвойдзе ў зьвяз з Расеяй ўмовах, прадыктаваных Крамлём. Ён цалкам сур'ёзна выказаў пажаданьне, каб ЭЗ адкрыла свой унутраны рынак для беларускіх тавараў. Выступаючы ў абарону адкрытага

[6] Гандлёвы абарот ЭЗ у 2006 г. аб'ём склаў 38,7 млрд. эўра, а імпарту — 28,8 млрд. эўра.

сумленнага дыялёгу з Захадам, ён адзначыў, што бягучы момант спрыяльны для паляпшэньня адносінаў ды пачатку распрацаваў супрацоўніцтва з ЭЗ у такіх узаемавыгадных сферах, як энэргетыка, транспарт, нелегальная міграцыя й г.д. Афіцыйныя асобы Беларусі заявілі таксама аб плянах лібэралізацыі візавага рэжыму краіны для грамадзянаў ЭЗ і выказалі надзею, што двухбаковыя дачыненьні могуць узьняцца з узроўню проста гандлёвых адносінаў да больш прасунутых формаў эканамічнага супрацоўніцтва.

Апрача таго, Беларусь зацікаўлена ў атрыманьні інвэстыцыяў з ЭЗ. Шмат якія дзяржаўныя кампаніі ды актывы могуць быць прыватызаваныя ў найбліжэйшай будучыні, прычым дзяржаўныя актывы ацэньваюцца ў 132 мільярды даляраў. Прыцягненьне замежных, у прыватнасьці, эўразьвязаўскіх інвэстыцыяў тым самым служыць і гарантыяй супраць будучай агрэсіўнай тактыкі Расеі. Сам Лукашэнка пасьля энэргетычнай крызы з Расеяй заявіў, што «калі б заходнія энэргетычныя канцэрны мелі долю ў беларускіх энэргатранспартных сыстэмах, Расея не была б у дачыненьні да нас настолькі жорсткай», ды дадаў, што «ў Расеі загараюцца вочы, калі гаворка заходзіць пра будучую прыватызацыю беларускай прамысловасьці» .

Аднак Лукашэнкава «новая зьнешняя палітыка» ня здолела спакусіць ЭЗ і не спрычынілася да дэмакратызацыі ўнутры краіны. Замест гэтага праэўрапейская рыторыка ўспрымаецца як раздражняльнік Масквы. Страхі перад сацыяльным і эканамічным каляпсам пасьля ўвядзеньня менш выгадных варункаў імпарту энэрганосьбітаў з Расеі не матэрыялізаваліся, а ўладныя пазыцыі Лукашэнкі не пахіснуліся. Ён захоўвае шырокую папулярнасьць і можа разьлічваць на ступень падтрымкі каля 50-60%, тым часам як антылукашэнкаўскі электарат складае крыху болей за 30% насельніцтва[7].

Так ці іначай расейскі фактар застаецца ключавым для замежнай палітыкі Беларусі. Нягледзячы на эканамічныя выдаткі, абумоўленыя ростам цэнаў на расейскія энэрганосьбіты, дачыненьні з Расеяй, выглядае, ідуць па папраўку, аб чым сьведчыў двухдзённы візыт Пуціна ў

з 2005 г. праталяваў 25% Гляд trade.ec.europa (PDF).

7. Вынікі ўзятыя з дасьледаваньня грамадзкай думкі, Менск у

сярэдзіне сьнежня 2007 г. Падчас яго Лукашэнка паспрабаваў прадэманстраваць міжнароднай супольнасьці адзіны расейска-беларускі фронт ды падкрэсьліў, што Беларусь і Расея ўжо 2007 вялізны ўнёсак у эканамічную, сацыяльна-палітычную стабільнасьць эўрапейскага кантынэнту і Эўрасаюзу і дадаў, што «мы чакаем такіх жа адэкватных дзеяньняў з боку Эўропы».

Аднак спэкуляцыям аб паскарэньні стварэньня расейска-беларускай саюзнай дзяржавы ў аглядным часе не наканавана матэрыялізавацца. «Атручаныя» ўзаемадаадносіны патрабуюць працяглай адбудовы. Беларусь працягвае плаціць больш высокую цану за газ і нафту (гэта было падчас сустрэчы ізноў пацьверджана). У адказ беларускі ўрад узьняў з 1 лютага 2008 г. на 16% транзытныя тарыфы на расейскую нафту, якая перапампоўваецца на захад па трубаправодзе «Дружба», што дасьць дадатковы даход у дзяржбюджэт у памеры 31 мільён далераў. Гэта супярэчыць лёгіцы пабудовы гэтак званай «саюзнай дзяржавы», у якой нафта й газ былі б аднолькава таннымі ў Беларусі, як у Расеі. Лукашэнкаў давер да Пуціна, як здаецца, пахіснуўся падчас энэргетычнай крызы, а ён сам хістаецца паміж пабудовай саюзнай дзяржавы з Расеяй і блякаваньнем гэтага працэсу. З 1996 г. не спыняюцца спрэчкі аб канчатковай форме саюзнай дзяржавы, нягледзячы на існаваньне праекту яе канстытуцыйнага акту.

Падчас апошняга візыту Пуціна ў Менск, калі ізноў усплыло пытаньне аб саюзнай дзяржаве пасьля энэргетычнай крызы, нішто не паказвала, што гэтым разам Лукашэнка будзе дзейнічаць іначай. Лукашэнка атрымаў крэдыт у памеры $ 1,5 мільярда, нібыта спэцыяльна падагнаны для таго, каб пакрыць страты беларускага бюджэту ў 2007 г. у памеры $ 1,6 мільярда, панесеных у выніку энэргетычнай крызы. Узамен Расея атрымала ад Лукашэнкі запэўненьні ў жаданьні разьмясьціць на тэрыторыі сваёй краіны расейскую тактычную ядзерную зброю ў адказ на разьмяшчэньне ва Ўсходняй Эўропе амэрыканскай супрацьракетнай абароны (US missile defence shield). Нягледзячы на зьнешні антураж падчас візыту Пуціна, ніякага істотнага прарыву ў пабудове саюзнай дзяржавы не адыбылося. Выглядае, што замест гэтага дачыненьні з Расеяй амаль вярнуліся назад у рэчышча «чыстага бізнэсу».

ІНСЭНТ
Тэндэнцыі
эўрапейскай
беларускай
Грамадзкай
думцы
наконт
некаторых
сацыяльна-
эканамічных
і палітычных
пытаньняў».

4. Пазыцыя ЭЗ да Беларусі пасьля энэргетычнай крызы

У апошнія чатыры гады замежная палітыка ЭЗ у дачыненьні да сваіх суседзяў перажыла істотную эвалюцыю, а менавіта была сфармулявана ЭПС, а таксама ў ЭЗ увайшлі суседзі Беларусі ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Гэта стварыла новыя магчымасьці для дачыненьняў паміж ЭЗ ды Беларусьсю. Ці зьмяніла расейска-беларуская энэргетычная крыза дынаміку дачыненьняў ЭЗ-Беларусь? На цяперашнім этапе ЭЗ схільны прытрымлівацца сваёй ранейшай пазыцыі: ЭЗ складзе Беларусі прапанову па ЭПС, калі Менск пачне выконваць неафіцыйны дакумэнт Камісіі ад сьнежня 2006 г. зь яго пералікам мераў па дэмакратызацыі. Аднак некаторыя дзяржавы-члены ЭЗ, здаецца, ужо цяпер гатовыя працаваць зь Беларусяй яшчэ глыбей. Апрача таго, Эўрапейская камісія дала зразумець, што можа разгледзець пэўныя формы дыялёгу збольшага на тэхнічным узроўні.

На сучасны момант Беларусь не зацікаўлена ў далучэньні да ЭПС, таму што цана, якую палітычная эліта мае заплаціць за ўзмацненьне сувязяў з ЭЗ, занадта высокая. У пляне дапамогі ЭПС можа ў найлепшым выпадку прынесьці нейкую суму паміж тымі, што зараз павінны атрымаць Малдова і Ўкраіна: Малдова атрымае 210 мільёнаў эўра на пэрыяд 2007-2010 гг., Беларусь не зацікаўлена ў Эўрапейскай палітыцы добрасуседзтва, таму што цана, якую палітычная эліта мае заплаціць за ўзмацненьне сувязяў з ЭЗ, занадта высокая.тады як Украіна атрымае за той самы пэрыяд 647 мільёнаў эўра. У дадатак да прамой фінансавай дапамогі Беларусь магла б скарыстацца з крэдытаў ад Эўрапейскага інвэстыцыйнага банку ды Эўрапейскага банку рэканструкцыі й разьвіцьця. Рост узаемнага гандлю праз доступ да рынку ЭЗ таксама быў бы выгадным для беларускай эканомікі. Аднак эканамічныя выгады, зьвязаныя з ростам супрацоўніцтва з ЭЗ, блякнуць у параўнаньні з субсыдыямі ды эканамічным супрацоўніцтвам з Расеяй нават пасьля нафтагазавай крызы. У дадатак Лукашэнку давялося б дэмакратызаваць беларускую палітыку й грамадзтва, тым самым сур'ёзна паставіўшы пад пагрозу сваю будучыню ў

якасьці прэзыдэнта Беларусі. Ён таксама быў бы вымушаны аслабіць кантроль над дзяржаўнай эканомікай, якая атрымлівала на працягу болей як дзесяцігодзьдзя шчодрыя датацыі з мэтай расшырэньня ягонай уладнай базы, задобрываньня яго прыхільнікаў і ўзбагачэньня найбліжэйшых хаўрусьнікаў.

Замест гэтага Беларусь выказала інтарэс да разьвіцьця прагматычных адносінаў з Эканамічныя выгады для Беларусі, зьвязаныя з ростам супрацоўніцтва з ЭЗ, блякнуць у параўнаньні з субсыдыямі з Расеі нават пасьля нафтагазавай крызы.ЭЗ, якія канцэнтраваліся б вакол супрацоўніцтва ў пэўных узаемавыгадных галінах ды засноўваліся на неўмяшальніцтве ў яе нутраныя справы. У верасьні 2007 г. намесьнік міністра замежных спраў Беларусі Валеры Варанецкі ізноў заклікаў да супрацоўніцтва на канфэрэнцыі ЭЗ «Працуйма разам — мацуйма эўрапейскую палітыку добрасуседзтва», заявіўшы, што «мы (Беларусь) прапануем ажыцьцявіць сур'ёзныя сумесныя эўрапейскія праекты для павышэньня бясьпекі транзыту, уключаючы фізычную бясьпеку нафта- і газатрубаправодаў».

Сапраўды, ролю Беларусі ў якасьці ключавой краіны для транзыту расейскай нафты й газу цяжка ня ўбачыць з Брусэлю, асабліва ў сувязі з ростам залежнасьці ЭЗ ад расейскай энэргіі. Агулам 46,7 мільярдаў кубамэтраў расейскага газу мелася прайсьці транзытам у ЭЗ празь Беларусь у 2007 г., з чаго 15,7 мільярдаў было пракачана праз трубаправод Белтрансгазу, а рэшта (каля 30 мільярдаў кубамэтраў) — празь беларускі ўчастак трубаправоду Ямал-Эўропа, які належыць расейцам. Каля 20% імпартаванага ЭЗ з Расеі газу праходзіць празь Беларусь, ідучы, галоўным чынам, у Польшчу, Нямеччыну ды Літву. У ЭЗ з асьцярогай пазіраюць на тое, як пад моцным расейскім ціскам Газпром вырывае 50% акцый Белтрансгазу. Гэтая ўгода адбываецца акурат тады, калі Эўрапейскі Зьвяз імкнецца сфармуляваць кагерэнтную зьнешнюю энэргетычную палітыку[8].

19 верасьня 2007 Камісія гэтаксама выставіла на парадак дня прапанову наконт трэцяга пакету пагадненьняў накатрыклад,

[8] Гл. напр.,

лібэралізацыі ў энэргетыцы, у якім

мяркуецца замацаваць патрабаваньне аб тым, што трэція краіны ды іх грамадзяне ня могуць набываць кантролю над разьмеркавальнай сыстэмай [Эўрапейскай] Супольнасьці (…), калі толькі гэта не дазволена пагадненьнем паміж ЭЗ і такой трэцяй краінай.

Таму няма чаго зьдзіўляцца, што энэргетыка — гэта адна з Ролю Беларусі ў якасьці ключавой краіны для транзыту расейскай нафты й газу цяжка ня ўбачыць з Брусэлю тых сфэраў, у якой ЭЗ і Беларусь маюць дачыненьне з даволі падобнымі клопатамі ды пастанавілі зрабіць папярэднія захады ў кірунку супрацоўніцтва. Двухбаковая дэлегацыя экспэртаў па энэргетыцы сустрэлася ў мінулым чэрвені, аднак наступныя сустрэчы былі адкладзеныя на няпэўны тэрмін Эўразьвязам пасьля шэрагу арыштаў маладых актывістаў апазыцыі. Тым ня менш, у галіне энэргетыкі чакаецца, што ЭЗ распачне зь Беларусьсю сур'ёзны дыялёг па энэргетычным супрацоўніцтве і ўвядзе ў дзеяньне мэханізм раньняга папярэджваньня.

Ня будучы ў стане падахвоціць афіцыйны Менск далучыцца да ЭПС, ЭЗ павінен апрабоўваць іншыя інструмэнты замежнай палітыкі. ЭЗ імкнецца працягваць і ўзмацняць сваю палітыку ў дачыненьні да беларускіх нізавых (grass-roots) арганізацыяў і грамадзтва ў цэлым. Нягледзячы на ўсю антыэўрапейскую прапаганду ў беларускіх дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, дасьледаваньні грамадзкай думкі паказваюць, што болей як 50% беларусаў падтрымлівае больш цеснае супрацоўніцтва з ЭЗ, а 36% прагаласавала У Брусэлі з асьцярогай пазіраюць на тое, як Газпром вырывае 50% акцый Белтрансгазу.б на рэфэрэндуме за ўступленьне сваёй краіны ў ЭЗ. Такі ўзровень падтрымкі ЭЗ ўнутры краіны больш чым дастатковы, каб апраўдаць больш актыўную палітыку ЭЗ да Беларусі.

У галіне дэмакратызацыі ды падтрымкі вольнай і дэмакратычнай грамадзянскай супольнасьці ЭЗ сутыкаецца з заканадаўчымі перашкодамі пры аказаньні фінансавай дапамогі арганізацыям грамадзкай супольнасьці, паколькі

the Conclusions of the European Council of 8 – 9 March 2007, а таксама the European Council's Action Plan (2007—2009) for an Energy Policy for Europe (PDF).

шмат якім НДА не дазваляюць зарэгістравацца альбо закрываюць іх пасьля рэгістрацыі. Падтрымка ЭЗ апазыцыйных рухаў застаецца таксама дэкляратыўнай і сымбалічнай. ЭЗ працягвае выдзяляць гранты НДА на пераважна апалітычныя й сацыяльна арыентаваныя праекты. Апрача таго, ЭЗ працягваць выдзяляць стыпэндыі студэнтам. Напрыклад, ЭЗ аказвае шчодрую фінансавую дапамогу Эўрапейскаму гуманітарнаму ўнівэрсытэту, які функцыянуе на выгнаньні ў Вільні. Аднак узьдзеяньне ЭЗ застанецца абмежаваным, пакуль беларускія ўлады будуць працягваць перасьлед НДА ды індывідуальна зацьвярджаць выдзяленьне ЭЗ стыпэндыяў для студэнтаў.

У галіне падтрымкі незалежных сродкаў масавай інфармацыі ў ЭЗ, здаецца, больш разьвязаныя рукі. У цяперашні час Эўрапейская Камісія фінансуе ў памеры 2 мільёнаў эўра падрыхтоўку праграм незалежнага тэлебачаньня і радыё, што вяшчаюць на Беларусь пры дапамозе міжнароднай спадарожнікавай тэлестанцыі RTVi ды радыёстанцыі «Эўрапейскае радыё для Беларусі», якая вядзе свае перадачы з Польшчы. Мэта Камісіі — забясьпечыць аб'ектыўную інфармацыю аб ЭЗ і яго палітыцы, а таксама аб міжнародных падзеях ды беларускай палітыцы. Яна таксама мае намер запусьціць у найбліжэйшыя месяцы праект па разьвіцьцю электроннага кантэнту на тэму Эўрапейскага Зьвязу й падзеяў на Беларусі. Падтрымка ЭЗ апазыцыйных рухаў застаецца дэкляратыўнай і сымбалічнай. ЭЗ працягвае выдзяляць гранты на пераважна апалітычныя й сацыяльна арыентаваныя праекты.Беларусь таксама скарыстаецца з агульнага праекту ЭЗ па падтрымцы СМІ, які скіраваны да ўсіх партнэраў па ЭПС. Аднак узьдзеяньне інфармацыйнай кампаніі ЭЗ застаецца абмежаваным. Нядаўняе дасьледаваньне грамадзкай думкі паказала, што толькі невялікая доля насельніцтва Беларусі глядзела RTVi (6,9%) альбо слухала радыёстанцыі, якія вяшчаюць з краінаў ЭЗ. Акрамя таго, амаль дзьве трэція (58,3%) беларусаў ня маюць доступу да інтэрнэту. Нарэшце, ЭЗ ня здолеў аказаць у Беларусі істотнай падтрымкі незалежнаму друку. Застаецца ўсё менш ды менш незалежных газэт, якія да таго ж выключаныя зь дзяржаўнай сеткі дыстрыбуцыі. У дадатак журналістаў, якія адмаўляюць самацэнзуру, надта часта перасьледуюць за паклёп на афіцыйных асобаў.

Эўрапейская палітыка да Беларусі стала прадметам больш ажыўленых дэбатаў паміж дзяржавамі-членамі ЭЗ пасьля пашырэньня ў 2004 г. Новыя дзяржавы-суседкі Беларусі, якія ўвайшлі ў ЭЗ, выступаюць за аднаўленьне палітычнага дыялёгу ды ўмацаваньне гандлёвых адносінаў. Нягледзячы на публікацыю свайго неафіцыйнага дакумэнта, у якім адлюстраваны прынцыповы бескампрамісны падыход, Камісія запрасіла таксама беларускіх другарадных афіцыйных асобаў (г. зн. намесьніка міністра замежных спраў) у Брусэль і арганізавала пасьля энэргетычнай крызы перамовы па энэргетычным супрацоўніцтве. Да таго ж цяпер, калі такія суседкі Беларусі, як Польшча, Літва і Латвія, ўступілі ў ЭЗ ды пачалі выказваць сваю зацікаўленасьць Беларусьсю на ўзроўні ЭЗ, выглядае, утварыўся пэўны вакуўм у каардынацыі. Напрыклад, ЭЗ у сьнежні 2006 г. сьпярша ня мог выключыць Беларусь з УСП дзеля супраціву з боку Польшчы й Літвы, якія баяліся, што гэта прынясе шкоду іх эканомікам. Кансэнсус быў нарэшце дасягнуты праз шэсьць месяцаў у чэрвені 2007 г.

Існуе таксама пытаньне аб тым, як палітыку ЭЗ да Беларусі ўспрымаюць усходнія дзяржавы-ўдзельніцы ЭПС. Дзяржавы ЭПС схільныя успрымаць свае адносіны з ЭЗ як чыста двухбаковыя ды не зьмяшчаюць іх у шырэйшы рэгіянальны кантэкст, прадугледжаны ЭПС. У выніку дзяржавы ЭПС не заўсёды падтрымліваюць палітыку ЭЗ да Беларусі. З прычыны зразумелых культурна-гістарычных сувязяў ды, перш за ўсё, гандлёвых дачыненьняў Украіна, Малдова й Грузія не заўсёды салідарызуюцца з заявамі Супольнай замежнай палітыкі і палітыкі бясьпекі (Common Foreign & Security Policy) ЭЗ па Беларусі; яны не падпісаліся пад забаронай на выдачу віз, уведзенай ЭЗ, і, напэўна, ня маюць намеру ўводзіць гандлёвых санкцыяў.

Калі дачыненьні паміж ЭЗ і Ўкраінай ператворацца ў «гісторыю посьпеху» ЭПС, то гэта зможа зрабіць пэўны ўплыў на Лукашэнку. Найбольш кідаецца ў вочы тое, што на працягу лета 2007 г. Украіна й ЭЗ дасягнулі дамоўленасьці аб аслабленьні шэнгенскіх візавых абмежаваньняў да ўкраінцаў, якая ўвайшла ў сілу ў студзені 2008 г. А вось для беларусаў у той самы час кошт шэнгенскіх віз вырас (да 60 эўра). Гэта тым

больш ускладніла жыццьцё народу Беларусі, бо краіна мяжуе з трыма новымі дзяржавамі-членамі ЭЗ, Польшчай, Літвой і Латвіяй, якія сталі часткай шэнгенскай зоны 21 сьнежня 2007 г. Падобна, ЭЗ і Ўкраіна рыхтуюцца да перамоваў пра паглыбленае пагадненьне аб свабодным гандлі, якое істотна палепшыла б доступ абодвух бакоў да рынкаў, тады як Беларусь сутыкаецца з гандлёвымі санкцыямі.

5. Высновы і рэкамэндацыі

ЭЗ мае ў сваіх руках няшмат эфэктыўных мэханізмаў узьдзеяньня на беларускі рэжым. Яго дасягненьні ў дэмакратызацыі па сягоньняшні дзень застаюцца досыць сьціплымі, паколькі ЭЗ можа мала зрабіць без супрацоўніцтва з боку беларускіх уладаў. Аднак беларускія ўлады жадаюць распачаць супрацоўніцтва з ЭЗ па шэрагу канкрэтных галіновых пытаньняў. Палітычныя рэжымы Цэнтральнай Азіі маюць шмат супольнага зь Беларусьсю.У дадатак Менск, здаецца, не выступае супраць наладжваньня нейкага палітычнага дыялёгу з ЭЗ, бо гэта можа таксама на пэўны час выбіць козыры з рук апазыцыі. ЭЗ у 2007 г. рабіў таксама спробы распрацаваць стратэгію па Цэнтральнай Азіі, з краінамі, чые палітычныя рэжымы маюць шмат супольнага зь Беларусьсю. Таму ЭЗ можа разгледзець шэраг дадатковых захадаў у дачыненьні да Беларусі, як, напрыклад:

- Прапанаваць пачаць дыялёг па правох чалавека (асабліва па ўвядзеньні маратора на сьмяротнае пакараньне, якое ў апошнія гады выкарыстоўвалася радзей, вызваленьні палітычных вязьняў ды спыненьні перасьледу НДА і палітычных актывістаў).

- Прапанаваць пачаць дыялёг аб аказаньні дапамогі ЭЗ арганізацыям беларускай грамадзкай супольнасьці й студэнтам (з мэтай зьняцьця перашкодаў, якія не даюць дапамозе ЭЗ эфэктыўна даходзіць да НДА й студэнтаў).

- Прапанаваць прамую дапамогу — у адрозьненьне ад проста фінансаваньня замежнага вяшчаньня — вольнаму друку й СМІ ў Беларусі для асьвятленьня падзеяў у ЭЗ пры дапамозе моўных

курсаў, навучальных праграм ды паездак у Брусэль. Такая прамая падтрымка можа палягаць на фінансаваньні ў Брусэлі шэрагу беларускіх «карэспандэнтаў у ЭЗ», якія б друкавалі свае рэпартажы па эўразьвязаўскай тэматыцы ў сваіх мясцовых газэтах.

- Зьнізіць кошт за візу з 60 да 35 эўра для пэўных катэгорыяў людзей (не прапануючы пры гэтым поўнага зьмякчэньня візавага рэжыму), напрыклад, студэнтам, навукоўцам, бізнэсоўцам, праваабаронцам, прадстаўнікам грамадзянскай супольнасьці, журналістам ды г. д.

- Працягваць тэхнічныя кансультацыі па супрацоўніцтве ў сфэры энэргетыкі ды дэкляраваць гатоўнасьць ЭЗ да інвэстыцый у энэргетычную інфраструктуру Беларусі.

Іншымі захадамі, якія б можна было разглядаць на больш аддаленую пэрспэктыву, пры ўмове, што прыведзеныя вышэй меры будуць выкананыя пасьпяхова, зьяўляюцца:

- Распрацаваць у аднабаковым парадку Плян дзеяньняў ЭЗ-Беларусь, які б дапоўніў неафіцыйны дакумэнт Эўрапейскай Камісіі ад сьнежня 2006 г. ды канкрэтызаваў прапанову па ЭПС.

- Далучыць Беларусь да адпаведных рэгіянальныя ініцыятывы па супрацоўніцтву, напрыклад, да «Паўночнага вымярэньня» (дзе б Беларусь заахвочвалася да ўдзелу ў супрацоўніцтве на ўзроўні экспэртаў). А таксама, магчыма, да «Сынэргіі Чорнага мора», якая ахопіць усходняе вымярэньне ЭПС ды дапоўніць галіновыя праграмы ЭЗ ў такіх сфэрах, як міграцыя, памежная ахова, барацьба з арганізаванай злачыннасьцю, бясьпека, энэргетыка, транспарт, экалёгія, каб падрыхтавацца да магчымага ўключэньня Беларусі ў ЭПС.

- Гарантаваць падтрымку ўключэньню Беларусі ў Раду Эўропы ў якасьці паўнапраўнага члена пры ўмове вырашэньня праблемаў з правамі чалавека.

- Гарантаваць падтрымку інтэграцыі Беларусі ў СГА.

У адказ беларускія ўлады маглі б пачаць рабіць невялікую колькасьць сымбалічных крокаў з малой палітычнай цаной са сьпісу ЭЗ захадаў па дэмакратызацыі, як напрыклад:

- Вызваліць усіх палітычных вязьняў. Гэта быў бы надзвычай сымбалічны жэст для ЭЗ ды беларускай апазыцыі, які не выглядае палітычна рызыкоўным для Лукашэнкі, чыя папулярнасьць застаецца высокай.
- Увесьці маратор на сьмяротнае пакараньне.
- Устрымлівацца ад абструкцыі працэсу рэгістрацыі і эфэктыўнага правядзеньня кампаніі кандыдатамі ад апазыцыі на надыходзячых парлямэнцкіх выбарах у 2008 г.
- Дазволіць рэгістрацыю беларускіх НДА, што забясьпечыла б большую празрыстасьць у дзейнасьці арганізацыяў грамадзянскай супольнасьці, а таксама дазволіла б НДА дзейнічаць свабодна і адкрыта.
- Палепшыць умовы для прафсаюзаў, каб рухацца ў накірунку зьняцьця гандлёвых санкцыяў ЭЗ (беларускія ўлады разглядалі крокі ў дадзеным напрамку).

Энэргетычная крыза ў студзені 2007 г. паміж Расеяй і Беларусьсю магла зрабіць Лукашэнкаў рэжым больш насьцярожаным да Расеі ды, магчыма, больш схільным да пошуку шляхоў паразуменьня з ЭЗ. Энэргетычнай бясьпекай заклапочаныя як Беларусь, так і ЭЗ. Калі тэхнічнае супрацоўніцтва ў гэтай галіне акажацца пасьпяховым, яно зможа падмуркам для супрацоўніцтва ў іншых сфэрах[9].

Галоўная перашкода на шляху дачыненьняў паміж ЭЗ і Беларусьсю палягае ў тым, што ў стратэгічным пляне Беларусь перад сабой, у адрозьненьне ад Украіны, Малдовы і Грузіі, паставіла задачу ўступленьня ў ЭЗ.

З ангельскай пераклаў Алесь Картэль
паводле http://www.ceps.eu

[9] Эўрапейская Камісія, не фактычна толькі што заявіла (28 студзеня 2008 г.) аб

Дадатак 1.

Меры па дэмакратызацыі, якіх дамагаецца ЭЗ

- Павага да *права* народу Беларусі *дэмакратычна выбраць свае кіраўніцтва* — да яго права азнаямляцца з усімі пагляданымі бачыць усіх кандыдатаў падчас выбараў; да права кандыдатаў ад апазыцыі і іх прыхільнікаў праводзіць выбарчую кампанію без перашкод, перасьледу й зьняволеньня; да незалежнага назіраньня за выбарамі, у тым ліку з удзелам беларускіх недзяржаўных арганізацыяў; да іх свабоды выражэньня сваёй волі й справядлівага падліку галасоў.
- Павага да *права* народу Беларусі *на незалежную інфармацыю* ды на *свабоду самавыражэньня*, напрыклад, дазваляючы журналістам працаваць без перашкод і перасьледу, не закрываючы газэтаў або перашкаджаючы іх дыстрыбуцыі.
- Павага да *правоў няўрадавых арганізацыяў* як важнай часткі здаровай дэмакратыі — не дапускаючы перашкодаў іх легальнаму статусу, перасьледу і нападак на членаў НДА, а таксама дазваляючы ім атрымліваць міжнародную дапамогу.
- *Вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў* — членаў дэмакратычных апазыцыйных партыяў, членаў НДА ды звычайных грамадзянаў, арыштаваных падчас мірных дэманстрацыяў ці сходаў.
- Правядзеньне скрупулёзнага і незалежнага *расьсьледаваньня ці перагляду справаў зьніклых людзей* (маюцца на ўвазе справы А. Красоўскага, В. Ганчара і інш. — **Рэд.**)
- Забясьпечыць *права* народу Беларусі на *незалежную і непрадузятую судовую сыстэму*, пры якой судзьдзі ня будуць падлягаць палітычнаму ціску, адвольнаму ды неабгрунтаванаму крымінальнаму перасьледу або палітычна матываваным прысудам, як зьняволеньне грамадзянаў за мірнае выражэньне сваіх паглядаў.
- Спыненьне практыкі адвольных *арыштаў* і *затрыманьняў*, а таксама кепскага абыходжаньня зь вязьнямі.
- Павага да *правоў* і *свабод* тых беларускіх грамадзянаў, якія належаць да *нацыянальных меншасьцяў*.
- Павага да правоў працоўнага народу Беларусі, да яго права аб'ядноўвацца ў прафсаюзы ды да права прафсаюзаў змагацца ў абарону правоў народу.
- Павага да *правоў* прадпрымальнікаў Беларусі працаваць бязь лішняга ўмяшальніцтва з боку ўладаў.

тым, што далейшыя тэхнічныя сустрэчы па энэргетыцы, транспарту й экалёгіі будуць мець месца пасьля вызваленьня Беларусьсю трох палітычных вязьняў: (А. Казуліна, А. Клімава і А. Здвіжкова. — **Рэд.**)

- Далучэньне да іншых краінаў Эўропы, якія скасавалі сьмяротнае пакараньне.
- Разблякаваньне ліній падтрымкі, якую АБСЭ, ЭЗ ды іншыя арганізацыі прапануюць Беларусі, каб памагчы ёй паважаць правы свайго народу.

Крыніца: Неафіцыйны дакумэнт Эўрапейскай камісіі «Што Эўрапейскі Зьвяз можа прынесьці Беларусі», 5 сьнежня 2006 г.

[image]

[image]

№ 1-2 (64-65) 2008

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2008/06/15**

[image]

Рашэд Чоудхуры
[1] Гл. ca.youtube.com

* * *

Барак Хусэйн Абама-малодшы нарадзіўся ў г. Гаралулу на Гавайскіх выспах у 1961 г. Яго бацькам быў Барак Хусэйн Абама-старэйшы, студэнт эканомікі з Кеніі, з народу луо, атэіст з мусульманскай сям'і. А маці была 19-гадовая Стэнлі Эн Данэм, белая амэрыканка агнастычных поглядаў, якая нарадзілася ў штаце Канзас, а ў той час жыла з бацькамі на Гаваях. Як кажа Абама, ягоны бацька быў «чорны, як смала» а маці «белая, як малако»[2]. Але ён сам, у сваім дзяцінстве, пра гэта асабліва не задумваўся.

Яму пашанцавала: ён нарадзіўся ў штаце, які першым [2] Obama, Barack. Dreams from My Father: A Story of Race and Inheritance. New York: Three Rivers Press, 2004. P. 11.
[3] Obama. Dreams from My Father. P. 6.
[4] Гл. Obama. Dreams from My Father. P. 11.
шлях да будучага пострасавага грамадзтва, пра якое марыць шматлікія амэрыканцы. На Гаваях было столькі амэрыканцаў азіяцкага паходжаньня, што белым быць цяжка замацаваць сваю дамінуючую ролю, якую яны мелі ў іншых штатах. Там будучыя бацькі Абамы змаглі пажаніцца, і таму Абама ня стаў змалку аб'ектам усялякай дыскрымінацыі. 1960 г., калі пажаніліся Абама-старэйшы й Данэм, ішоў пік прадстаўнікамі розных расаў яшчэ афіцыйна лічыўся крымінальным злачынствам у больш як палове штатаў[3]. Да таго ж Эн Данэм падчас свайго дзяцінства, праведзена ў розных штатах, навучылася ігнараваць расавыя падзелы, чым ганарыліся яе бацькі[4]. Паявіўшыся на сьвет, Барак Абама знайшоў цёплае месца ў сваёй амэрыканскай сям'і.
Шлюб Данэм з Абамам-старэйшым аказаўся недаўгавечным. Яны разьвяліся ў 1965 г., і Эн выйшла замуж за іншаземца, на гэты раз інданэзійца-мусульманіна Лоло Сутэра,

і маладая сям'я, разам з Абамам-малодшым, зьехалі ў Джакарту, дзе Абама пражыў чатыры гады. Там, паводле яго былых настаўнікаў, Абама быў зарэгістраваны ў сваіх школах (дзяржаўнай сьвецкай і прыватнай каталіцкай) як мусульманін і наведваў урокі ісламу. Зульфін Ады, інданэзійскі сябра дзяцінства Абамы, кажа, што яны раз-пораз хадзілі ў мячэт[5]. Цяпер, калі Абама зьяўляецца веруючым і практыкуючым хрысьціянінам, гэтая інфармацыя аб яго дзяцінстве яму ў палітычным пляне, мякка кажучы, не дапамагае. Сам ён разглядае сваё жыцьцё ў мусульманскім асяродзьдзі ў дзяцінстве як вопыт, які дазволіць яму, калі ён стане прэзыдэнтам, палепшыць зносіны ЗША з ісламскім мірам не таму, што ён падзяляе мусульманскую веру, а таму, што ён разумее мусульман гэтак, як іх не разумеюць звычайныя прадстаўнікі амэрыканскай палітычнай эліты.

Вучыўся Абама ў Джакарце на інданэзійскай мове, але яго маці зрабіла ўсё для таго, каб ён не забываўся ангельскай й паляпшаў яе. Пяць разоў на тыдзень яна будзіла сына а чацьвёртай гадзіне раніцы й вучыла яго ангельскай па тры гадзіны[6]. Але гэтага было недастаткова і, дбаючы аб далейшай адукацыі сына, Данэм адправіла яго да сваіх бацькоў на Гаваі.

Калі Абаму было 10 гадоў, ён вярнуўся ў ЗША. Ён ня толькі зноў апынуўся ў амэрыканскім асяродзьдзі, але таксама, ізноў уплывам чарнаскурых сяброў і кніг, напісаных чорнымі інтэлектуаламі, як Уільям Дзю Бойз, пражыў унутраную эвалюцыю. Абама заўсёды быў амэрыканцам афрыканскага паходжаньня. Цяпер жа ён стаў афраамэрыканцам, які свядома далучаў сябе да этнічнасьці й культуры, якой раней ён падзяляў.

Як першаму афраамэрыканцу ў сваёй сям'і, Абаму давялося самому знаходзіць сябе ў амэрыканскім расавым кантэксьце. Пошукі працягваліся не адзін год і задалі тон усёй далейшай кар'еры Абамы. Калі Абама распачаў сваю прэзыдэнцкую кампанію, на кароткі час у афраамэрыканскіх кругах ЗША паўстала пытаньне: а ці Абама дастаткова чорны? Тое, вядома, мова не пра колер ягонай скуры, бо колеры скуры афраамэрыканцаў моцна вар'іруюцца, і ў іх многія (зусім ня

[4] Ibidem. P. 20 - 21.

[5] Watson Paul. Islam unknown factor in Obama bid: Candidate downplays his connection during boyhood in Indonesia. Baltimore Sun. 2007. 16 March.

[6] Obama Barack. Dreams from My Father. P. 47 - 49.

ўсе!) — цёмныя. Афраамэрыканцы — гэта перадусім супольнасьць са сваёй культурай і сваёю гісторыяй. Таму і насунулася пытаньне наконт Абамы, бо яго продкі не прайшлі праз рабства, ніколі не жылі на поўдні ЗША, дзе паражэньне ў Грамадзянскай вайне дагэтуль выклікае ў некаторых белых жыхароў горыч і нянавісьць да чарнаскурых. Але ў адказ на гэтыя пытаньні жонка Барака, Мішэль Абама, сказала проста й каротка: «Перастаньце гаварыць абы-што»[7].

І сапраўды, увесь шлях, які прайшоў Абама, ад школьніка Гаваях да сэнатара ад штату Ілінойс у Вашынгтоне, — гэта шлях сьвядомага афраамэрыканца. Падчас вучобы ў Калюмбійскім універсытэце ў Нью-Ёрку ён зразумеў, што

Я меў свабоду жыць так, як жыла большасьць чорных у сярэдняй клясы ў Мангэтане: я меў свабоду выбраць маёмасьць вакол якога я мог бы арганізаваць сваё жыцьцё, свабоду стварыць каляж стыляў, сяброў, бараў, палітычных прыналежнасцяў. Аднак я адчуў, што на якім-небудзь этапе, магчыма, калі ў цябе паявяцца дзеці і ты вырашыш, што застанесься ў горадзе толькі дзеля прыватнай школы, ці калі ты пачнеш карыстацца ўначы таксі, а не мэтро, ці калі ты вырашыш, што твайму дому патрэбны швайцар, то твой выбар будзе немагчыма зьмяніць, бо падзел будзе замацаваны так, што празь мяжу нельга будзе прайсьці і ты знойдзеш сябе па той бок лініі, па якім ты ніколі не намерваўся быць[8].

Інакш кажучы, з добрай адукацыяй і грашыма (рэчамі, якіх паводле сацыялягічных і эканамічных прычынаў, злучаных з расізмам, бракуе сярод афраамэрыканцаў) прыходзіцца быць такімі, як усе, а гэта ў амэрыканскім кантэксьце значыць быць такімі, як белыя. Абама гэтай спакусе не паддаўся і застаўся верны свайму выбару.

Нават у сёньняшняй Амэрыцы з усімі яе сацыяльнымі дасягненьнямі быць сьвядомым і грамадзка актыўным афраамэрыканцам значыць змагацца за свае правы. Для некаторых чорных гэта азначае адасабленьне ад масы амэрыканцаў, хоць такі падыход становіцца сярод большасьці чорных усё больш маргінальным. Сёньня адным зь яго галоўных выразьнікаў зьяўляецца Луіс Фарахан і ягоны рух

7. Michelle Obama blasts black through' talk // USA Today. 2007. 12 August.

8. Obama. Dreams from My Father: A Story of Race and Inheritance. P. 122.

«Нацыя ісламу», які грунтуецца на ідэалёгіі, якая ўяўляе сабою мяшанку некаторых аспэктаў ісламу з расізмам супраць белых. Адзін з былых лідэраў гэтага руху, Мэлкам Экс, падчас хаджу дзівіўся братэрству белых і чорных мусульман, якое ён пабачыў у сьвятых месцах ісламу. Вярнуўшыся ў ЗША, ён заклікаў афраамэрыканцаў да суніцкага ісламу і супраць чорнага сэпаратызму, за што быў забіты ў 1965 г. З таго часу большасьць сяброў руху адмовілася ад расізму «Нацыі ісламу». Таму, калі Фарахан нядаўна выказаў сваю падтрымку Абаму, той ад яе публічна адмовіўся.

Зь іншага боку, афраамэрыканскіх лідэраў заклікаюць да барацьбы за аднолькавыя правы й магчымасьці для ўсіх амэрыканцаў у імя адзінай амэрыканскай нацыі. Гэты падыход увасаблялі баптысцкі пастар Марцін Лютэр Кінг-малодшы і вышэйзгаданы Мэлкам Экс (пад канец свайго жыцьця). Абодва за свае погляды аддалі жыцьцё і тым самым дасягнулі найвышэйшага ўзроўню папулярнасьці сярод афраамэрыканцаў. Нягледзячы на адмову ад сэпаратызму, афраамэрыканскія лідэры звычайна выступаюць супраць асыміляцыі чорных у культуру й сьветапогляд белых. Гэтая супярэчнасьць паміж жаданьнем быць роўнымі з большасьцю амэрыканцаў і нежаданьнем быць яе цемнаскураю вэрсіяй відавочная ў асабістым і палітычным жыцьці Абамы.

Цэлы год у Нью-Ёрку Абама сустракаўся зь белаю дзяўчынаю, у якую закахаўся. Аднойчы яна запрасіла яго да сваіх бацькоў, чый дом належаў ім на працягу шасьці пакаленьняў. У ім былі фатаграфіі яе дзеда з «прэзыдэнтамі, дыпляматамі і прамыслоўцамі». Абама зразумеў, што, калі б яны засталіся разам, ён бы пачаў жыць у сьвеце сваёй сяброўкі, а яна ў ягоным — не. Таму ён зь ёю разьвітаўся. Перад канцом іх адносінаў яна сказала яму, што ня можа быць чорнаю, нават калі хоча, і запыталася, чаму яму недастаткова яе такой, якой яна ёсьць. З гэтага эпізоду ў Абамы засталося пачуцьцё сораму, якое часткова тлумачыць ягоную аб'яднаўчую палітыку, да якой ён потым прыйшоў[9].

Пасьля сканчэньня Калюмбійскага ўнівэрсытэту й Гарвардскай школы права (дзе яго прызначылі першым цемнаскурым

[9] Obama, Dreams from

рэдактарам тамтэйшага праўнага часопісу й дзе ён упершыню дасягнуў пэўнай вядомасьці) Абама працаваў арганізатарам грамадзкага жыцьця ў Чыкага. Паверыўшы ў Ісуса Хрыста, ён уступіў у Аб'яднаную царкву Хрыста імя Тройцы, пастар і большасьць прыхаджанаў якой былі афраамэрыканцамі. Паводле Мэлісы Гэрыс-Лейсвэл, прафэсара Прынстанскага ўнівэрсытэту й былой прыхаджанкі гэтай царквы, Абама далучыўся да яе, каб замацаваць сваю афраамэрыканскую ідэнтычнасьць[10]. Аднойчы Абама пачуў казань тамтэйшага пастара Джэрэмаі Райта на тэму «Дзёрзкасьць надзеі», і гэты выраз потым зрабіўся ключавым у лексыконе самаго Абамы. Але ў апошнія дні Райт, які ажаніў Абаму і хрысьціў абедзьвюх ягоных дачок, праславіўся на ўсю Амэрыку за іншыя свае выказваньні. 2003 г. падчас казані Райт прамовіў:

Улады будуюць усё большыя турмы... і хочуць, каб мы сьпявалі «Божа, блаславі Амэрыку». Не, не і не. Ня «Божа, блаславі Амэрыку», а Божа, праклі Амэрыку... за забойства невінаватых людзей.... Божа, праклі Амэрыку за тое, што яна паводзіць сябе з нашымі грамадзянамі гэтак, нібы яны нейкія нелюдзі[11].

Райт таксама дадаў, што тэрарыстычная атака на ЗША 11 верасьня 2001 г. — ня што іншае, як наступства амэрыканскай замежнай палітыкі.

Ад гэтых слоў Абаму давялося адмаўляцца гэтак жа як і ад падтрымкі Фарахана[12], дарма што Фарахан — чалавек зусім іншага ад Абамы ідэалягічнага кірунку, а Райт — сябра і нават настаўнік Абамы. Але Абама ня хоча апынуцца на «тым баку, на якім не намерваўся быць», нават калі на гэты раз на ім стаіць ня белая эліта, а група афраамэрыканцаў. Сёньня ён у першую чаргу амэрыканец, які добра ведае, хто ён і адкуль. Сваю ролю ў гэтай самаўпэўненасьці адыграў ягоны шлюб зь Мішэль, карэннаю жыхаркаю Чыкага зь вялікай афраамэрыканскай сям'і, да якой цяпер належыць і Абама, а таксама наладжваньне Абамам цёплых сувязяў са сваёю кенійскаю сястрою Аўмаю, а таксама неаднаразовыя вандроўкі ў Кенію, дзе Абама пазнаёміўся са шматлікімі сваякамі, наведаў магілы бацькі ды дзеда, постацяў, якія раней амаль

10 Mendelberg T. The Race Card: Campaign Strategy, Implicit Messages, and the Norm of Equality. Princeton, 2001. P. 210–211.

11 Milbank D. Sins of Trinity // Newsweek. 2008. 24 March.

12 Kilgore E. Not Generation Obama? Perhaps // New York Times. 2008. 17 March.

адсутнічалі ў ягоным жыцьці.

Даведаўшыся нарэшце, хто ён такі, і сфармаваўшы тым самым сваю даволі складаную ідэнтычнасьць, Абама пачаў шукаць спосабы амэрыканцаў да аб'яднаньня. Падчас сваёй прамовы ў зьезьдзе Дэмакратычнай партыі ў 2004 г. Абама прадставіў сваё разуменьне сваёй краіны. Пад акампанэмэнт авацыяў ён сказаў:

Няма лібэральнай Амэрыкі й кансэрватыўнай Амэрыкі. Ёсьць Злучаныя Штаты Амэрыкі. Няма белай Амэрыкі й чорнай Амэрыкі, Амэрыкі лацінаамэрыканцаў і Амэрыкі азіятаў. Ёсьць Злучаныя Штаты Амэрыкі[13].

Ён таксама нагадаў удзельнікам зьезду й тэлегледачам, што ў штатах, дзе папулярныя дэмакраты, людзі таксама моляцца «магутнаму Богу», а ў штатах, дзе папулярныя рэспубліканцы, таксама ёсьць «сябры-геі». Іншымі словамі, ён заклікаў амэрыканцаў пазбавіцца стэрэатыпаў, якія падзяляюць іх адзін ад аднаго. Паводле Абамы, «мы — адзін народ». Менавіта гэта прагнула пачуць амэрыканская публіка, асабліва лібэральная. І гэтыя словы ў адзін момант зрабілі з Абамы адну зь вядучых палітычных постацяў краіны.

Нядаўна дарадца кампаніі Гілары Клінтан, Джаралдын Фэрара, якая балятавалася на пасаду віцэ-прэзыдэнта ў 1984 г., выказала меркаваньне, што калі б Абама быў белым мужчынам ці жанчынаю любой расы, ён бы не дасягнуў сваёй цяперашняй пазыцыі[14]. Пасьля гэтага ёй давялося пакінуць кампанію Клінтан, бо ў сёньняшняй Амэрыцы такія выказваньні ад аўтарытэтнай асобы лічацца недапушчальнымі. У гэтых словах, аднак, ёсьць доля праўды. На грамадзкую дзейнасьць Абаму натхніла ягоная самаідэнтыфікацыя як афраамэрыканца. На палітычную дзейнасьць яго часткова натхнілі ідэі ягонага чорнага пастара ў афраамэрыканскай царкве. Але ці можна зьвесьці ўсю асобу Абамы да яго расы? Вядома, што не. Як кажа сам Абама,

праўда, што мая ідэнтычнасьць пачалася з расы, але на ёй ня скончылася й не магла скончыцца. У любым выпадку, дзякуючы таму, што я вырашыў верыць[15].

[12] Obama Barack. On My Faith and My Church // Huffington Post. 2008. 14 March.

[13] Гл. ніжэй: www.youtube.com

[14] Silva Mark. Geraldine Ferraro: 'If

Абама стаў увасабленьнем надзеі мільёнаў амэрыканцаў, што ён
бачыць ня проста Амэрыку, дзе ўсе роўныя, якой бачыць
будучыню многія чорныя лідэры, але таксама Амэрыку, дзе
усе амэрыканцы аб'яднаныя. І паважаюць яны яго ня толькі
часткова таму, што ён не зьяўляецца прадстаўніком
эліты, ад каго такія словы б рызыкавалі гучаць фальшыва. А
калі Абама кажа, што

[15] Obama. Dreams from My Father… P. 111.

Калі на Паўднёвым боку Чыкага ёсьць дзіця, якое ня ўмее чытаць, гэта мяне кранае, нават калі дзіця не маё. Калі дзесьці ёсьць чалавек сталага ўзросту, які ня можа заплаціць за лекі, якія яму выпісалі й які павінны выбіраць паміж лекамі й платаю за кватэру, ад таго я раблюся бяднейшым, нават калі гэта ня мой дзед ці баба. Калі ёсьць арабска-амэрыканская сям'я, якую арыштоўваюць бяз доступу да адваката й без належнага працэсу, гэта пагражае маім грамадзкім свабодам[16] —

то яму вераць. І хочуць бачыць сваім прэзыдэнтам чалавека,
якому неабыякавыя пакуты розных маргіналізаваных
такой моцнай ды заможнай краіне, як ЗША.

[17] Wayne Leslie. Forget Iowa. How About That Antarctica Vote? // New York Times. 2008, 16 March.

[18] Гл. напр. http://en.wikipedia.org/wiki/United_States_presidential_election,_2008

[16] Ёсьць
[17] Wayne Leslie. Forget Iowa. How About That Antarctica Vote? // New York Times. 2008, 16 March.
[18] Гл. напр. http://en.wikipedia.org/wiki/United_States_presidential_election,_2008
Obama, Dreams from My Father… P. 111.
Swayne, Race Matters in the 2008 Election. P. 16.
Майсеенка, Ці можа чорны стаць прэзыдэнтам ЗША? // Наша Ніва, 2008, 10 сакавіка.
http://nashaniva.com/?c=ar&i=3
амэрыканцаў, якія прыйшлі на выбарчыя ўчасткі, прадстаўленых дэмакратамі для
мяжою, Абама атрымаў 66 %
галасоў[17]. На тэрыторыі ЗША на сёньняшні дзень Абама
выйграў папярэднія выбары ў 30 штатах і рэгіёнах[18]. Ёсьць
вялікая верагоднасьць, што ён стане наступным прэзыдэнтам
ЗША. Ад Абамы чакаюць таго, што ня могуць абяцаць іншыя
чорныя лідэры накшталт дэмакрата Джэсі Джэксана, бо для іх
раса застаецца ў пэўнай меры лініяй падзелу. І таксама ад яго
чакаюць такога аб'яднаньня грамадзтва, якога краіна ня бачыла
за ўвесь час панаваньня ў ёй белых англасаксонскіх
пратэстантаў (г. зв. WASP-аў), нягледзячы на вялікі сацыяльны
прагрэс.

Абама не пакідае абыякавымі людзей, якія раней у
амэрыканскай палітыцы ня бачылі нічога, што магло іх
натхніць. Тысячы маладых людзей, якія раней ставіліся да
палітыкі даволі цынічна, удзельнічаюць у гэтых выбарах і
збольшага аддаюць свае галасы Абаму. Таксама за яго
галасуюць старэйшыя людзі, якія раней галасавалі супраць

усіх. Ёсць сярод яго прыхільнікаў і тыя, хто параўноўвае Абаму з амэрыканскімі героямі накшталт Джона Кэнэдзі. Сярод тых ёсць прадстаўнікі самой сям'і Кэнэдзі[19]. Чаму? Галоўная прычына ў тым, што, як сказаў аднаму амэрыканцу емэнскі цырульнік, калі абяруць Абаму, гэта пакажа, што «гісторыя Амэрыкі ўсё-ткі не хлусьня»[20].

Барак Абама сьцьвярджае, што Амэрыка дастаткова вялікая, каб у ёй знайшлося месца для мараў усіх, чый лёс зьвязаны з ёю[21]. Разам зь ім такою хочуць бачыць сваю краіну ўсе амэрыканцаў. Яны хочуць бачыць Амэрыку пастрасаваўшы, як марыў Марцін Лютэр Кінг, людзей будуць судзіць «не па колеры іх скуры, а па зьмесьце іх асобаў». Яны марацьпаказаць краіне, якую зноў будуць паважаць, а не баяцца ці бэсьціць пашаземцы, ад эўрапейцаў да афрыканцаў і азіятаў. Яны хочуць удзельнічаць у будаваньні і ўмацаваньні такой Амэрыкі, і вераць, што Абама зможа гэта зрабіць.

Ібо ёсць, галоўнае пытаньне ў тым, ці здолее Абама зьдзейсьніць тыя зьмены, якія абяцае. Для гэтага ёсць шмат падстаў. Перш-наперш, яго могуць не абраць, і на прэзыдэнцкай пасадзе можа апынуцца значна больш кансэрватыўная Клінтан альбо рэспубліканец Джон МакКейн. Верагодна, што і Клінтан, і МакКейн, калі нехта зь іх стане прэзыдэнтам, унясе пэўныя карэктывы ў амэрыканскую палітыку, але ісьці так далёка, як Абама, ніводзін зь іх не гатовы. Па-другое, Абаму могуць забіць, і гэта жахлівая магчымасьць абмяркоўваецца шматлікімі прыхільнікамі Абамы, якія баяцца, што зь ім можа здарыцца тое, што здарылася з Кінгам, Эксам і Кэнэдзі[22]. Па-трэцяе, і больш верагодна, Абама можа апынуцца ў стане Джымі Картэра, які ня змог зьдзейсьніць большасьці сваіх плянаў, пакуль быў прэзыдэнтам, бо ня меў падтрымкі Кангрэсу.

Аднак магчыма, што Абама ўнясе істотныя зьмяненьні ў амэрыканскае палітычнае поле. Дакладней, іх ён ужо ўнёс. Ён цяпер немагчыма гаварыць пра амэрыканскую палітыку (ці нават аб ЗША ўвогуле), не згадваючы пры тым той факт, што ўвасабляе «хударлявы хлопец са сьмешным імем» Барак Хусэйн Абама.

19 Kinkaid, Jamaica. Obama and the Kennedys: Is Camelot Coming Back? // BBC News. 2008. 28 January.

20 Sullivan, Andrew. The View from Yemen // The Daily Dish. 2008. 10 February.

21 Obama, Barack. The Audacity of Hope: Thoughts on Reclaiming the American Dream. New York: Crown Publishers, 2006. P. 268—269.

22 Istook, Ernest Jr. Is Barack Obama the Next John F. Kennedy?

Assassination — With Ted Kennedy // Editor & Publisher. 2008. 29 January.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 1-2 (64-65) 2008
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2008/06/17
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2008/06/17
[image]

Ігар Марзалюк

Як для мяне, дык відавочным ёсць той факт, што рэальны кантынуітэт існуе акурат паміж рускай супольнасцю ВКЛ і намі, сучаснымі беларусамі. Пошукі беларуска-літвінаў — марная справа. Спробы рэанімаваць агучаны ў свой час Янам Станкевічам тэрмін «летувіс» для пазначэння этнічных літоўцаў нічога, акрамя няёмкасці, не выклікаюць. Дарэчы, той тэрмін не сам Станкевіч прыдумаў. Ён яго запазычыў з публіцыстыкі шавіністычна настроеных колаў эндэкаў, якія скарыстоўвалі яго з выразна абразлівым падтэкстам для літоўцаў сэнсам[2].

Неабходна падкрэсліць тую акалічнасць, што абазначэнне моўнай і этнічнай спецыфіцы гістарычнай Літвы мясцовым інтэлектуалы тэрміны «літвіны» і «літоўская мова» ў адрозненне да беларускамоўнага «простага», сялянскага і месцамі гарадскога насельніцтва Заходняй Беларусі нават на пачатку XIX ст. ужывалі. Прафесар Віленскага універсітэта Ігнат Анцута ў сваіх «Падарожных запісках…» 1828 г. выразна падзяліў насельніцтва Гарадзеншчыны паводле моўнай прыкметы:

На шляху з Вільні ў Ліду мястэчка Жырмуны абазначае мяжу паміж рускай і літоўскай мовамі. Аднак у ваколіцах ёсць адна вёска, дзе жыхары гавораць па-літоўску, хоць навокал усе руская мова[4].

1. Дарэчы, ці не ў беларускіх чарговы раз інфармаваў мяне Сяргей Плахій, я сам атрымаў прыемную магчымасць азнаёміцца з тэкстам С. Плахія.
2. Кравцэвіч, А. Тэрмін «Літва» ў гістарыяграфіі // Гістарычны альманах. Т. 9. Гародня, 2003. С. 106.

Адам Міцкевіч так сама ніколі не распайсюджваў майменне «літвін» на заходнебеларускіх сялян, носьбітаў беларускай мовы. Як даравы ніколі не атаясамліваў іх традыцыю з уласнай:

> *<…> З усіх славянскіх народаў русіны, гэта значыць* сяляне *Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі наибольшую колькасць агульнаславянскіх рысаў.* У іх *казках і песнях ёсць усё. Пісьмовых помнікаў* у іх *мала, толькі «Літоўскі Статут», напісаны* іхняй мовай, *самай гарманічнай і з усіх славянскіх моў найменш зменены. Усю* сваю *гісторыю на зямлі* яны *прайшлі ў страшэннай галечы і прыгнёце*[5].

Для Адама Міцкевіча вобраз старасвецкай Літвы — адназначна вобраз балцкай дзяржавы. Ягоны Навагрудак у «Гражыне» — то горад балцкі, літоўскі, і любымі беларускімі гісторыкамі-міфолагамі «ліцвінамі-славянамі-беларусамі» тут нават «не пахне»... Прыгадайма хоць бы апісанне падрыхтоўкі пахавання Гражыны.

Той самы вобраз Літвы і ў «Конраду Валенроду». «Свае» багі — багі балцкія, літоўская мова — мова балцкая, свае спевы — то спевы вайдэлотаў[6].

Паказальныя ў гэтым сэнсе і разважанні Уладзіслава Сыракомлі аб гістарычнай мяжы Літвы і Русі ў яго зімовым творы «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» (1853). Збіраючыся, кажучы пра Літву і Русь, разумее пад гэтымі тэрмінамі, апрычоныя, адметныя народы. Адны — балты, другія — славяне. У той частцы гістарычнай Літвы, дзе ён жыве, у любым яго сэрцу Верхнім Панямонні, літоўцаў (= летувінаў) сярод простага люду ўжо няма — бо яны, у выніку асіміляцыі, сталі славянамі па звычаях, мове і традыцыях:

…зычлівы чытач, які захоча выправіцца з намі ў цяперашнюю вандроўку па маіх былых ваколіцах, *няхай прабяжыць вокам па геаграфічнай карце — ад вусця да вытокаў Нёмана ў Мінскай губерні і спыніцца непадалёк ад гэтых вытокаў … з паўночнага*

---

[3] Ён сам родам з Малой Бераставіцы, што на Гарадзеншчыне (ей часты Бераставіцкі раён Гродзенскай вобласці), сын уніяцкага святара.

[4] Урывак з надарожных запісак прафесара Віленскага універсітэта Ігната Анацэвіча пад час праезду яго праз адну частку Гродзенскай губерні ў ліпені і жніўні 1822 года // Габрусевіч, С. А.; Марозава, С. В. Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё. Спадчына. Гродна, 2005. С. 175.

[5] Філаматы і філарэты. Зборнік. Менск, 1998. С. 122.

[6] Філаматы і філарэты. Зборнік. Менск, 1998. С. 224—225, 245, 246—250.

боку Нёмана ўпадае тут у яго рака Сула. На малых картах яна пазначана толькі паўколам, на большых — напісана і яе назва. Амаль у тым жа самым месцы перасякае Нёман, ідучы з усходу і поўначы, старая мяжа паміж Рускай Славяншчынай і Літвой. На карце ўсё гэта — у адным месцы, але на зямлі ад Сулы да таго перасячэння мяжы праз Нёман — добрая палова мілі; тут якраз і мая сядзіба Залуча са сваім сціплым набыткам. Аднак мая тэрыторыя не абмяжоўваецца гэтым мізэрным кавалкам зямлі, а цягнучыся аж за згаданую мяжу Славяншчыны, уключае ў сябе вёску, названую Жукаў Барок, дзе ўпадае ў Нёман невялікі ручай Ячонка. На паўночны захад, там, дзе вусце Сулы і Залуча, была яшчэ ўласна Літва, праз крок на паўднёвы ўсход, дзе сёння вёска Жукаў Барок, — ужо руска-славянскія ўладанні дрыгавічоў, крывічоў і г. д. Тут, за якія дзве тысячы крокаў ад майго дамка, я стаю на высокай гары, адкуль адкрываецца такі шырокі кругагляд, адкуль не раз азіраў я бясконцы свет, такі прывабны здалёку, не раз пасылаючы малітву Небу; стаю на гары тварам да сонца, што заходзіць недзе за Нёманам за лес Бярштаны, і крычу: «Направа адсюль ляжала літоўская зямля, край Пяркуна і сардэчнай Мільды, налева пачыналася зямля славянская, зямля сыноў Славы, прыхільнікаў Ессэ і Святавіда; потым з гэтага левага боку адбілася тут хрысціянская песня і рэха касцельнага звону, а з правага — хрыпаваты гук літоўскага рогу; тут, дзе стаю, спакойны складальнік вершаў, — праходзіла мяжа двух рыцарскіх народаў, у кожнага з якіх — свая будучыня, народаў, такіх розных сваімі норавамі, верай, звычаямі ...

Аднак жалезнае плячо літоўскіх князёў яшчэ ў XIII стагоддзі знесла, як Самсон браму філістынаў, мяжу сваёй дзяржавы недзе далёка ва ўладанні мінскіх і полацкіх князёў. Рынгольд, літоўскі князь, бацька Міндоўга, у 1235 г., г. зн. шэсцьсот сямнаццаць гадоў назад, атрымаўшы перамогу пад Магільнам (4 мілі ад Залучы) над кіеўскім князем Святаславам, Дзмітрыем Друцкім і Лявонам Уладзімірскім, заняў тутэйшыя славянскія ваколіцы, зліў іх з Літвой, знёсшы гэтую мяжу. З таго часу тут ужо была Літва; Міндоўг, Вітаўт, Гедымін, Альгерд і яго дзеці сталі ўжо ўладарамі гэтых ваколіц; але панаванне Евангелля і крыжа шырылася тут так жа сама хутка, як панаванне літоўскага мяча і сякеры; з крыжам і Евангеллем літоўскія людзі прымалі чужую для сябе мову і звычаі народаў, ад якіх

узялі веру. А з прычыны таго, што рэлігійная прапаганда вялася не мячом, а хлебам і соллю, пры дапамозе суседскай прыязнасці і шчырай любові, то поўная асіміляцыя тутэйшых літоўцаў прайшла так дасканала, што не толькі тут, але нават у ваколіцах Наваградка, даўняй сталіцы Рыгольдаў і Міндоўгаў, дарэмна было б шукаць сярод люду чаго-небудзь літоўскага — звычаяў, грамадскіх парадкаў, мовы ці абрадаў. Калі што і нагадвае старое паганства, то без сумнення носіць хутчэй характэрныя рысы славян, чым літоўцаў

[7].

Польскамоўны літвін Адам Ганоры Кіркор ясна ўсведамляў этнічныя адрозненні паміж насельніцтвам «Літоўскага Палесся». Нідзе і ніколі ўсходнеславянскае беларускае насельніцтва Гарадзеншчыны і Віленшчыны ён літвінамі не называў. Надзвычай выразна сістэма поглядаў на этнічныя падзелы ў «Літоўскім Палессі» (= гістарычнай Літве) адлюстравана ў трэцім томе «Живописной России» (1882). Літоўцы тут заўсёды выразна аддзяляюцца ды супрацьпастаўляюцца сваім славянамоўным суседзям[8].

[7] Гл. Сакалоўскі Ул. Ул. Этнічныя межы Літвы // Спадчына. 1992. № 1. С. 11—13, 14.

[8] Жывописная Россия. Наше Отечество. Т. III. Ч. 1. Литовское Полесье. Изд. 2-е. СПб., 1893. С. 6, 11, 13, 14.

Кіркор, як і Ігнат Даніловіч, Ян Карловіч, Ян Станкевіч у сваёй рэцэнзіі на кнігу В. Бузескула, лічыў, што вынік тых этнічных працэсаў, якія ішлі ў Беларускім Падзвінні ў XIII—XVIII стст., — гэта ўтварэнне ў 1882 годзе этнічна беларускага народу ды ўсведамленне імі ўрэшце сваёй адрознасці ад польскасці:

Шматлікія крыніцы сведчаць, што, пачынаючы з XVII ст., адрознівалася вузейшая айчына — Літва — і шырэйшая, Рэч Паспалітая, якую часта называлі Польшчаю. Як грамадзяне Кароны, так і літвіны былі паводле тагачасных уяўленняў палякамі. Гэтае паняцце, аднак, мела тады палітычны, а не этнічны характар. Гэткі ж палітычны характар мела акрэсленне «літвін»[9].

Паводле польскага даследчыка, у другой палове XIX ст. адбываецца знікненне шматузроўневай свядомасці і асяроддзі на карысць нацыянальнай польскасці. Пры гэтым

[9] Бардах, Ю. Шляхецкім

стаў выразна заўважны ўжо ў 50-х гг. XIX ст., але асабліва – у часы студзеньскага паўстання 1863 г. ды наступных гадоў часах. У выніку

Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2002. С. 299.

на глебе, якою была шматнацыянальная супольнасць Вялікага Княства Літоўскага, вырас грамадска-палітычны феномен, які атрымаў найменне «краёўцаў». Спасылаючыся на традыцыю Вялікага Княства Літоўскага, яны абвяшчалі салідарнасць насельніцтва краю без увагі на мову і вызнанне, проціпастаўляючы яе, як пісаў М. Здзяхоўскі, «шалеючым нацыяналістычным жарсцям». Прымат краёвай повязі канчаткова сфармаваўся ў пачатку XX ст. Ідэалогія краёўцаў была, можна сказаць, працягам і разам з тым трансфармацыяй шматузроўневай нацыянальнай свядомасці. Пазіцыі краёўцаў і блізкія да іх супрацьлеглі часцей сярод інтэлектуальнай эліты, чым у сярэдніх слаях. Значная большасць краёвае шляхты і інтэлігенцыі адназначна лічыла сабе палякамі[10].

Праўда, пагадзіцца з тэзісам Ю. Бардаха, што шляхта гістарычнай Літвы ў XVIII — сярэдзіне XIX стст. мела двухузроўневую нацыянальную свядомасць, цяжка. Цытаваныя ім крыніцы якраз сведчаць, што *нацыянальная* свядомасць у гэтых літвінаў была польская, у якасці *ідэалагічнай радзімы* паўсюль выступае менавіта *Польшча*. Літвінская свядомасць, літвінскае самаакрэсленне — гэта акрэсленне субэтнічнае, правінцыйнае, рэгіянальнае. Вялікіх ідэалагічных нацыянальных літвінскіх канатацый, права на асобную дзяржаўнасць для Літвы у будучым, без непадзельнай сувязі з Польшчай, у створаных мясцовай польскамоўнай элітай тэкстах мы проста не знойдзем.

[10] Бардах, Ю. Шляхі да нацыі і яе гісторыі / Ю. Бардах // Вялікае Княства Літоўскае. Мінск, 2002. С. 310–311.

[11] Восстание и война 1794 года в Литовской провинции (по документам архивов Москвы и Минска). Составление, редакция и предисловие кандидата исторических наук Евгения Константиновича Анищенко. Менск, 2001. С. 3.

[12] Пільштынова, Саламея. Аповесці мінулых дзён. — Мінск: МВКЛ, 1993. С. 20.

Напрыканцы XVIII ст. выстоўваўся тэрмін «Літоўская правінцыя»[11], уся ж дзяржава звыкла і будзённа называлася «Польшчаю». Лагічным вынікам паланізацыйных працэсаў шляхты ВКЛ у XVIII ст. становіцца выкарыстанне апошнімі для самаакрэслення тэрміна «паляк».

Знакамітая навагрудская лекарка, шляхцянка Саламея Пільштынова з Русецкіх ва ўласнаручна напісаным і

выдадзеным у 1760 г. у Стамбуле творы «Авантуры майго жыцця» зусім недвухсэнсоўна засведчыла сваю не русінскую, не літвінскую, а менавіта польскую ідэнтычнасць. Саламея Пільштынова ведае, што замуж яе выдаюць з Навагрудскага ваяводства, з Літвы[12], але гэты тэрмін, як і вытворны ад яго тэрмін «літвінка», ёй нідзе ў тэксце ў якасці ўласнага эндаэтноніма не скарыстоўваецца. Літва для яе — гэта проста правінцыя Польшчы, асобны яе рэгіён. Яе радзіма — Польшча, а яна сама полька:

…ужо з Польшчай назаўсёды развіталася, і тут, у Турцыі, жыць вырашыла, хіба што дзеля таго, каб іншыя, якія ведалі мяне, не дакаралі, што я, полька, маючы мужа і дзяцей у Польшчы, усе мае тыя часовыя пацехі пакінула, а сама адна ў чужы край без усялякае дапамогі і пацехі выправілася, каб жыць і памерці ў Бозе ў тым краі[13].

Падобнае самаакрэсленне ёй паслядоўна выкарыстоўваецца па ўсім тэксце кнігі:

…А мяне выратаваў Бог ласкаю сваёю і строй мой польскі … я ж хрысціянка, полька… дамагаючыся мяне, быццам я не полька, а вугорка…[14].

У Рэчы Паспалітай у XVIII ст., у эпоху Асветніцтва, працэсы нацыятварэння ішлі тым самым шляхам, што і ў Францыі, дзе ўпершыню на еўрапейскім кантыненце (пасля Вялікай Французскай рэвалюцыі) была створана «палітычная» грамадзянская мадэрная нацыя. Як паказаў Рышард Радзік, атаясамленне паняццяў «нацыя» і «дзяржава» было характэрна для свядомасці абываталяў Рэчы Паспалітай перад яе падзеламі. У гэтай асветніцкай канцэпцыі нацыі-дзяржавы ўжо не было месца для існавання дзяржавы некалькіх народаў, дзяржавы шматнацыянальнай[15].

У рэчышчы гэтай асветніцкай канцэпцыі нацыі-дзяржавы планавалася ўжо не спантанная, а цалкам свядомая асіміляцыя ўсіх непольскамоўных этнічных супольнасцяў

[13] Пільштынова, Саламея. Авантуры майго жыцця. С. 19.

[14] Тамсама. С. 27, 74, 89.

[15] Radzik, R. Między dziejami Polski

Паспалітай. Паказальныя ў сувязі з гэтым погляды пісьменніка і рэфарматара палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай Тамаша Калантая:

Юстыцыя няхай прамаўляе адной і дзяржаўнай [krajowej] для народаў мовай... Удасканаленая родная мова, ужытая ў адукацыі і прынятая для ўсіх спружынаў ураду ... склейвае ўсе правінцыі. І той край папраўдзе можна назваць адной нацыяй [narodem], які разумеецца на адной мове, якому мовы адукацыі для права і ўраду досыць[16].

Г. Калантай увогуле лічыў, што рускі народ якраз таму і быў адзін у Рэчы Паспалітай і бунтаваў, бо *«…ён ня ўмеў адрозьніць і межаваў з маскоўскай дзяржавай»*[17]. А паланізацыя вышэйшых людцоў проста неабходная для інтарэсаў польскай шляхецкай дзяржавы.

Пра поўную польскую моўную асіміляцыю сялян-русінаў марыў і «беларускі нацыянальны герой» Тадэвуш Касцюшка:

Прывучаць іх трэба да польскай мовы, няхай па-польску будуць усе іхныя набажэнствы. З часам у іх увойдзе польскі дух[18].

Сваю польскасць Т. Касцюшка выразна засведчыў і ў лісце да імператара Аляксандра I:

Нарадзіўся я літвінам… Заслона будучыні пакрывае яшчэ лёсы маёй роднай зямлі і шмат іншых частак маёй айчыны… Жаданне, якое мне засталося, г. зн. каб сысці ў магілу з супакойлівай пэўнасцю, што ўсе падданыя В. Імп. Вялікасці палякі будуць карыстацца з Тваіх, Найяснейшы Пане, дабрадзействаў[19].

Такім чынам, калі б Рэч Паспалітая працягвала існаваць, то ў выніку развіцця буржуазных адносін і надання грамадзянскіх правоў мяшчанам і сялянству магла б сфармавацца адзіная польская нацыя, у якой і беларусы, і літоўцы, і ўкраінцы трактаваліся б як яе складовыя субэтнасы. Толькі падзелы Рэчы

14 Ibidem. S. 58.

15 Kowecki, J. Kościuszko wobec «Rusinów naszych» // Między Wschodem a Zachodem. Rzeczpospolita XVI—XVIII w. Warszawa, 1993. S. 240.

16 Цыт. пав.: Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2002. С. 301.

17 Lityński, J. Tadeusz Kościuszko. Między etniczną a wspólnotą narodową. Lublin, 2000. S. 54—55.

18 Ibidem. S. 57.

Паспалітай паставілі «крыж» на рэалізацыі падобнага варыянту развіцця. Не верыце? Ідэалізацыяй «заходнерусізму», «масквафільствам», «дырэктыўнай гістарыяграфіяй» запахла? Дык можа прыслухаемся да высноваў польскага калегі Анджэя Валіцкага, які прытрымліваецца акурат падобных поглядаў:

Без падзелаў Польшчы і ўсяго таго, што адбылося пасля іх, колькасць еўрапейскіх народаў была б значна меншай...[20]

Да аналагічных высноваў, што і А. Валіцкі, прыйшоў і шэраг знаны польскі беларусазнаўца, як Рышард Радзік. Для яго няма сумневу, што калі б не падзелы Рэчы Паспалітай, то ў ёй сфармавалася б мадэрная польская палітычная нацыя, аналагічная па сваіх прынцыпах фармавання французскай, а беларусам, літоўцам і ўкраінцам быў бы наканаваны статус складовай, інтэгральнай часткаю той нацыі. Толькі падзелы Рэчы Паспалітай спачатку запаволілі, а потым і ўвогуле прынілі гэты працэс[21].

Дазволім сабе адну разгорнутую цытату з тэкстаў Р. Радзіка, якая надзвычай выразна і недвухсэнсоўна сведчыць пра яго ўяўленні на гэты конт:

У адукаванай Цэнтральна-Усходняй Еўропе, падобна, як і на захадзе кантынента, мова трактавалася як сродак грамадскай камунікацыі, што садзейнічаў распаўсюджванню асветніцтва, інтэграцыі грамадства ў межах дзяржавы, а не як вызначальнік этнічнай, нацыянальна-культурнай еднасці. У Рэчы Паспалітай афіцыйнай мовай, гэтак жа, як і элітарнай, была польская; на землях Венгерскай Кароны афіцыйнай мовай з'яўлялася лацінская. Калі на абедзвюх гэтых тэрыторыях фармаваліся палітычныя нацыі, іх эліты траплялі пад культурную уніфікацыю, аб'ядноўваючыся вакол каштоўнасцей надэтнічных. Хутчэй тыя працэсы адбываліся ў Рэчы Паспалітай, больш марудна — у Венгрыі (у найменшай ступені — у падпарадкаванай ёй Харватыі). Як жа сталася, што ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, нягледзячы на падобныя да заходніх асветніцкія тэндэнцыі, утварыліся нацыі не палітычныя, а культурныя, грамадска-тэрытарыяльныя межы

[20] Walicki, A. Kwestia narodowa w myśli rosyjskiej czasów porozbiorowych // Archiwum Historii Filozofii i Myśli Społecznej. T. 38. 1993. S. 220.

[21] Radzik, R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Lublin, 2000. S. 54—65, 82, 83.

якіх супалі з межамі моўнымі? Адказаць на пытанне можна, калі ў адзінстве разглядзець тры асноўныя прычыны.

Па-першае, у адрозненне ад досыць стабільнага тэрытарыяльна-дзяржаўнага ўкладу, што існаваў у Заходняй Еўропе, два вялікія грамадска-палітычныя арганізмы Цэнтральна-Усходняй Еўропы — Венгрыя і Польшча — заставаліся раз'яднанымі і на доўгі час падпарадкаванымі сваім суседзям. Захопнікі былі супраць працэсаў мадзьярызацыі і паланізацыі рознаэтнічнага плебейскага насельніцтва абедзвюх тэрыторый; яны прыпынілі працэс фармавання палітычных нацый (у Беларусі польская мова ва ўстановах з часам была зменена на рускую, у Венгрыі Іосіф II увёў замест лаціны мову нямецкую). Аднак яны не мелі шматвяковай традыцыі панавання на тых землях, былі не ў стане дзейсна і хутка зрусіфікаваць ці згерманізаваць «пашкоджанае» грамадства, да таго ж мусілі канкурыраваць з польскай і венгерскай элітай. Замест існаваўшага калісьці ў цэнтральна-ўсходняй частцы кантынента двухузроўневага этнічна-нацыянальнага ўкладу (напрыклад, беларускамоўнае сялянства — польскамоўная шляхта), што захаваўся на Захадзе (напрыклад, правансалец — галійскі француз), на Усходзе ўтварыўся трохузроўневы ўклад: этнічны плебс (напрыклад, беларусы) — нацыя дамінуючая (напрыклад, палякі) — нацыя пануючая (напрыклад, рускія). Даўнія традыцыйныя адносіны, калі прадстаўнік плебсу, займаючы больш высокае сацыяльнае становішча ў грамадстве, лічыў за «нармальнае» перайманне на абшарах былой Рэчы Паспалітай польскай культуры, паддаваліся хістанням, а потым ламаліся. На землях Цэнтральна-Усходняй Еўропы, населеных плебейскімі класамі, пачалі сціравацца дзве ўзаемна канкуруючыя нацыянальныя ідэалогіі (нацыі дамінуючай і пануючай). З'явілася нацыянальная альтэрнатыва, што не існавала раней, — сведчанне магчымасці выбару — а з часам узніклі і думкі пра ўласную этнічную непаўторнасць.

Другім фактарам, што вызначыў напрамак развіцця нацыянальных працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе, была немагчымасць распаўсюджвання на тых землях вольнай дэмакратычнай ідэалогіі, якая стварала б з насельніцтва тых земляў роўных адзін аднаму абывацеляў, маючых аднолькавыя

правы і абавязкі. Дзейсным спосабам дасягнення гэтага быў працэс допуску плебейскіх пластоў да палітычных паўнамоцтваў. У сітуацыі распаду традыцыйных — усталяваных у эпоху феадалізму — грамадскіх структур паўторная інтэграцыя адбывалася праз парушэнне нацыянальных сувязей, што асноўваліся на агульнадаступным культурным змесце. Рэакцыяй Расіі на ўхваленне Канстытуцыі 3 траўня 1791 года стаў другі падзел Польшчы. У Венгрыі апошняй значнай спробай хаця б часткова паўтарыць французскую нацыянальную мадэль была рэвалюцыя 1848 года, падаўленая пры дапамозе Расіі і Аўстрыі. Кошут цешыўся ў той час надзеяй, што лозунгі аб вольнасці на французскі ўзор з'яднаюць усю этнічную супольнасць вакол нацыі ў яе палітычным разуменні і мовай яе будзе венгерская. У самадзяржаўнай, эканамічна адсталай царскай Расіі афіцыйная руская мова не была носьбітам дэмакратычных правоў і вольнасцей.

Інакш кажучы, недахоп магчымасцей рэалізацыі дэмакратычных лозунгаў у кансерватыўных краінах гэтай часткі кантынента стаў, з аднаго боку, прычынай запаволенасці працэсаў нацыянальнай самаідэнтыфікацыі ў асяродку прыгонных сялян (якія мысляць у маштабе вёскі, парафіі, акругі), але затое з другога — павольнай эвалюцыяй паняцця нацыі ў накірунку яе культурнага (этнічна-моўнага) разумення.

Па-трэцяе, перыяд, у часе якога прыгонныя сяляне не маглі падвергнуцца масавым працэсам нацыяналізацыі (у нашым выпадку — паланізацыі і мадзьярызацыі) — галоўнай умовай для гэтага было распрыгоньванне сялян — быў «выкарыстаны» для заклікаў звярнуцца да асэнсавання этнічнай своеасаблівасці іх нацыянальных рухаў і выпрацоўкі нацыянальнай ідэалогіі

22.

Дзеля чаго я так падрабязна спыніўся на поглядах аб нацыянальнай свядомасці польскамоўнай эліты ВКЛ позняй Рэчы Паспалітай напрыканцы XVIII і першай палове XIX стст. такіх польскіх гісторыкаў, як Ю. Бардах, Л. Валіцкі і Р. Радзік? Справа ў тым, што іх «другое прышэсце» ў творах некаторых беларускіх гісторыкаў даволі істотна адрозніваецца ад арыгінала. Для сучасных польскіх

22 Гл. аб гэтым: Радзік Р. Беларусы ў (Пол. Дах. Ашчы). Мінск, 2002. С. 110—111.

даследчыкаў няма сумневу, што беларускі народ, як і ўкраінскі (маецца на ўвазе насельніцтва «польскай» Украіны, але не Гетманату), і літоўскі, у выніку паланізацыйных працэсаў стаў плебейскім этнасам, страціў эліту, якая стала польскай і па культуры, і па свядомасці. Для Ю. Бардаха ёсць фактам, што прынамсі ў другой палове XIX ст. пераважная большасць літвінскай шляхты стала *нацыянальнымі палякамі*, а для Р. Радзіка, А. Валіцкага і Януша Тазбіра рэч сама сабой зразумелая, што ўжо ў XVIII — першай палове XIX стст. прадстаўнікі эліты ВКЛ былі *палякамі ў тагачасным сэнсе таго слова*, іх прыналежнасць да «палітычнай нацыі» грунтавалася на адзінстве мовы, культурнай і праўнай традыцыі ўсёй эліты «Польшчы». Таму і ўжыванне тэрмінаў «літвін», «паляк-караняж», «мазур» ва ўмовах тагачаснай (першая палова — сярэдзіна XIX ст.) шляхецкай рэальнасці ніколі не скарыстоўвалася іх носьбітамі дзеля нацыянальнага супрацьпастаўлення, гэта назвы рэгіянальныя, субэтнічныя, бо ўсе яны — палякі, маюць адзіную Айчыну — Польшчу[23]. А вось у інтэрпрэтацыі А. Смаленчука ўсё гэта выглядае трохі іначай:

Нельга забываць, што ў першай палове XIX ст. паняцце польскасці на беларускіх і літоўскіх землях па-ранейшаму звязвалася толькі з прадстаўнікамі вышэйшых сацыяльных колаў грамадскасці. Тэрмін «паляк» быў у першую чаргу палітонімам, які сведчыў пра прыналежнасць да шляхецкай «палітычнай нацыі».

…Шкада, што калегі з Расіі не заўважылі феномену літвінскай традыцыі. Ліцвінства грунтавалася на гістарычных і культурных традыцыях ВКЛ, на пэўнай тэндэнцыі да дэмакратызацыі (яна праяўлялася ў цікавасці да народнай культуры), на ўсведамленні сваёй этнакультурнай адрозначасці як ад расійцаў, так і палякаў з этнічнай Польшчы. Яно было часткай патрыятызму Рэчы Паспалітай, але адрозніваласа высокай ступенню аўтаномнасці. Паводле веравызнання, большасць прадстаўнікоў ліцвінскай традыцыі належала да Каталіцкага Касцёлу, а паводле грамадскага стану — да шляхты. Літаратурныя і публіцыстычныя творы ў межах гэтай традыцыі ствараліся пераважна на польскай, а таксама на літоўскай і беларускай мовах. Апошняя перадавалася на пісьме

[23] Radzik, R. Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Lublin, 2000. S. 86, 87, 113.

лацінкай. Цэнтрам ліцвінскай традыцыі была Вільня.

Аналіз палітычнай і культурнай дзейнасці ліцвінаў дазволіў польскаму даследчыку Юліюшу Бардаху зрабіць высновы пра падвоенасць іхнай свядомасці, якую часта вызначаюць формулай gente Lithuanus (vel Ruthenus), natione Polonus (ліцвін або русін з паходжання, паляк па нацыянальнасці). Прычым апошняе датычыла палітычна-прававой сферы.

Гэтая з'ява сфармавалася ў апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай і захоўвалася ўсё XIX ст. А пэўныя ейныя праявы (краёвасць) назіраліся яшчэ ў першай траціне XX ст. У межах ліцвінства выспяваў літоўскі, а пазней таксама і беларускі нацыяналізм

24.
Куды больш рэалістычна і адэкватна выглядае рэфлексія на творы Р. Радзіка Тадэвуша Новака:

Р. Радзік паказвае на прыкладзе Францыі, як фармавалася сучасная палітычная нацыя. Далей аўтар параўноўвае французскую, а таксама іспанскую схему з сітуацыяй у Рэчы Паспалітай, каб прадэманстраваць, як шляхта дзяржавы «абодвух народаў» (літвінаў і палякаў) задзіночылася ў адзіную польскую *нацыю, але са сваімі рэгіянальнымі адметнасцямі.*

…У разглядзе эвалюцыі польскай нацыянальнай супольнасці на Беларусі Р. Радзік канстатуе паступовую змену разумення польскасці *ў Краі: ад палітычна-дзяржаўнага да этнамоўнага. Пры гэтым ён адзначае, што за «палякаў» паступова пачыналі ўважаць у т. л. просты люд «крэсаў» былой Рэчы Паспалітай, і не толькі тутэйшыя шляхічы, але і самі расійцы і еўрапейцы ўвогуле. Аўтар кажа, што расійскі фактар паспрыяў аддзяленню тутэйшага люду ад польшчыны і, спасылаючыся на аднаго з даследнікаў, дадае, што без падзелаў Польшчы і таго, што па гэтым адбылося, колькасць еўрапейскіх народаў была б значна меншаю і карта Еўропы выглядала б цяпер зусім іначай. Гэта вельмі важнае назіранне. Сапраўды, ці можна было б спадзявацца, што, калі б захавалася Рэч Паспалітая, палонацэнтрычныя тэндэнцыі не прывялі б да таго, пра што*

1. 24. Смалянчук, А. Плебейскія нацыі Імпэрскія пэрыфэрыі // ARCHE. 2006. № 11 (51). С. 35.

мроіў Т. Касцюшка? Ці не існавала б ад Кракава да Віцебску Польшча, падобная да сённяшняй Францыі, і які лёс напаткаў бы мову тутэйшых сялянаў — «рускую», і без таго насычаную паланізмамі, літоўскую, якая ўжо ў канцы XIX ст. мусіла была амаль — на шчасце, не назаўсёды — адступіць з-пад аколіцаў Вільні?.. Магчыма, тутэйшым русінам наканавана было б паўтарыць лёс правансальцаў, а літвінам — басконцаў[25].

Іначай як недарэчны жарт можна ўспрымаць прэтэнзіі некаторых адраджэнскіх беларускіх гісторыкаў на «беларусізацыю» ды «прыватызацыю» Адама Міцкевіча, больш за тое, цвярдзіць аб ягонай беларускасці, называць «нашым» паэтам. Нагадаем: Адам Міцкевіч быў не проста свядомы сваёй нацыянальнай польскасці (што не перашкаджала яму мець рэгіянальную, субэтнічную, літвінскую свядомасць), а з'яўляўся адным з творцаў мадэрнага польскага нацыяналізму, абгрунтоўваў у сваёй працы «Кнігі народу польскага і польскага пілігрымства» канцэпцыю польскага каталіцкага месіянства, даводзіў богаабранасць палякаў як народа-пакутніка[26]. Яго Польшча — то і Карона, і Літва, і Русь. Папросту — «ад можа да можа». *«Litwin i Mazur — bracią są; czyż kłócą się bracia o to, iż jednemu na imię Władysław, drugiemu Witowt? Nazwisko ich jedne jest: nazwisko Polaków»*[27].

Такім чынам, калі і трэба каго вінаваціць у «смерці» польскамоўных літвінаў, то толькі іх саміх. Калі і трэба каго вінаваціць у «смерці» польскамоўных літвінаў, то толькі іх саміх. Яны самі зрабілі свой, цалкам свядомы, выбар на карысць Польшчы і польскасці.Яны самі зрабілі свой, цалкам свядомы, выбар на карысць Польшчы і польскасці.

Гэта зусім недвухсэнсоўна вынікае з дакументаў часоў паўстанняў 1831 і 1863 гг.

У сваім звароце да сойму ў 1831 г. шляхта Літвы, Валыні, Падолля і Украіны выразна засведчыла сваю прыналежнасць да польскай нацыі, да Польшчы, з якой лучаць яе ў адно нацыянальнае і культурнае цэлае гістарычная традыцыя, звычаі і родная (натуральна, што польская) мова[28].

Падчас студзеньскага паўстання 1863 г. шляхта Віцебшчыны ў

[25] Новікаў, Т. Вялікае княства // Спадчына. 2005. № 1. Мінск. С. 238—239.

[26] Мабильков, А. С. Народы Центральной Европы: формирование национального самосознания XVIII—XIX вв. Санкт-Петербург, 1997. С. 100—101.

[27] Mickewicz, A. Księgi narodu polskiego i pielgrzymstwa polskiego. Warszawa, 1986. S. 80.

[28] Tam sama. Rdzenni Litwini, Mieszczanie Litewscy, Litwa etniczna a ziemie dawnego Księstwa Litewskiego, Lublin, 2000. S. 125.
[29] Тамсама.

Белая Русь, як і другія Русі, была інтэгральнай часткай сярэднявечнай і паганскай Літвы… прайшло яшчэ тры стагоддзі, цягам якіх Літва, падзяляючы з Польшчай свабоды, славу і, нарэшце, апошнюю нядолю, зліпася з ёй у адну польскую нацыю [naród][29].

Баляслаў Ліманоўскі, апісваючы падзеі канца пяцідзесятых гадоў XIX ст., зусім недвухсэнсоўна маніфеставаў і сваю рэгіянальную літвінскасць, і сваю нацыянальную польскасць:

Нам літвінам, г. зн. польскай моладзі з гістарычнае Літвы, ішлося перадусім аб тое, каб Літва спалучыла свае рухі з рухамі Кангрэсовай Польшчы… Гэтыя нашыя намаганні да аб'яднання Літвы з Польшчаю, аднак, пазней памылкова ацэньваліся як дзяржаўніцкае, цэнтралістычнае імкненне на карысць выключна польскай нацыянальнасці. Мы сапраўды прагнулі вяртання Рэчы Паспалітае ў яе даўніх межах, але паводле перакананняў мы былі федэралістычнымі рэспубліканцамі і не толькі хацелі забяспечыць правы ўсім нацыянальнасцям, што ўваходзілі ў яе склад, але, як прыхільнікі народа, падтрымлівалі пачуццё нацыянальнае самастойнасці, якое абуджалася сярод літоўска-рускага народу[30].

Для Ю. Бардаха няма сумненняў, што пазіцыя Ліманоўскага, — гэта пазіцыя *літоўскіх палякаў*, а не каго-небудзь іншага.

[30] Цыт. па: Бардах Ю. Из истории Великого княжества Литовского. Минск, 2002. С. 302.

Адам Ганоры Кіркор, вызначаючы сябе літвінам на краёвым узроўні, разам з гэтым пачуваў сябе, як і пераважная большасць людзей яго кола, людзей аднаго з ім сацыяльнага паходжання, палякам па нацыянальнасці. Менавіта літвіны, паводле Кіркора, з'яўляюцца «першымі» палякамі сярод астатніх палякамі вышэйшага гатунку ў параўнанні з «караняжамі». Яны задаюць тон у развіцці высокай польскай культуры, твораць сучасную польскасць высокага кшталту. Ды што там казаць! Уся новая польская літаратура створана імі[31].

Слаўнае мінулае Літвы, як і Русі, паводле Кіркора, — *гэта мінулае, якое не мае будучыні*. Літва і Русь (для Кіркора = Беларусь) запазычылі больш высокую польскую цывілізаванасць і культуру, іх зліццё з Польшчаю, палучэнне польскай нацыянальнасцю, факт безумоўна пазітыўны ў прагрэсіўны[32].

Другая палова XIX ст. стала тым часам, калі частка літвінскай, польскамоўнай шляхты цалкам і беспаваротна ўсвядоміла сябе палякамі па нацыянальнасці, перастала скарыстоўваць да сябе акрэсленне «літвіны» ўвогуле. Меншасць жа (насамрэч адзінкі) далучылася да літоўскага і беларускага (у канцы XIX — пачатку XX стст.) нацыянальна-вызваленчага руху.

Пра гэтую з'яву з гумарам пісаў Юзаф Мацкевіч:

Бо цёця Пафця выйшла замуж за літвіна яшчэ тады, калі усе жыхары б. Вялікага Княства Літоўскага называлі сябе літвінамі. Але пакуль падрастаў Генрых, іх ужо пачалі называць «літваманамі». Тады літвіны пачалі зваць сябе палякамі, а літваманы — літвінамі. Справа аказалася досыць заблытаная, а часам непрыемная. «Мама, — спытаў ён, — ці наша цёця Пафця — літваманка, ці яна літвінка-полька, але не літвінка?..»[33]

[32] Тамсама. С. 135—136.
Вельмі красамоўнае адлюстраванне ў беларускім выпадку знайшло ў нацыянальным самавызначэнні трох братоў Іваноўскіх — Вацлаў стаў беларусам, Юры — палякам, Тадэвуш — літоўцам. Кожны з іх, як вядома, адыграў асобную ролю ў абранай імі нацыянальнай галіне[34].

«Простыя» беларускія рыма-каталікі, сяляне і дробная шляхта цалкам натуральна працягвалі польшчыцца, а ў другой палове XIX ст. гэты працэс набыў амаль што незваротны характар. Па ўсёй Беларусі ў 1860-я гады не ведаў пра такое дзіва, як беларусы рыма-каталікі. Дарэчы, менавіта «злыя», «змаскалізаваныя» мясцовыя беларускія інтэлектуалы «заходнярускай» (і ці не першым — Міхайла Баброўскі) традыцыі першымі пачалі скарыстоўваць «лінгвістычны» аргумент — родную мову насельніцтва — дзеля акрэслення яго нацыянальнай

[31] *гэта* Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Литовское и Белорусское Полесье. Репринтное воспроизведение издания 1882 года. Т. III. Ч. 1 — Ч. 2. Мн., 1993. С. 124, 126—129.

[33] Цыт. пав.: Туронак, Ю. Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі. Мінск, 2006. С. 18.

[34] Гл. Беларусы. С. 12—13.

прыналежнасці. Менавіта яны, а не высакародныя краёўцы, залічылі ў шэрагі беларускага народа старакаталіцкае, у асноўнай сваёй масе балцкага паходжання, насельніцтва Заходняй Беларусі.

Паняцце «паляк» у беларускім выпадку і цяпер самым цесным чынам звязана з рыма-каталіцкай ідэнтычнасцю. Калі раней было не так, то сёння ў Беларусі на тэрыторыі Гродзенскай не жыло б больш за 300 тысяч палякаў (25,9 % насельніцтва вобласці)[35]. Паказальнае і тое, што значная частка беларускіх палякаў, паводле дадзеных апошняга перапісу, назвала сваёй роднай мовай беларускую[36]. Але гэта чамусьці анійкім чынам не адбілася на іх нацыянальным самавызначэнні. «Польскія» Вялікдзень, «польскія» могілкі, «польская» вера — хіба ж не чуў падобных азначэнняў у сучасным беларускім горадзе ці вёсцы? Прычым — і на ўсходзе, і на захадзе краіны.

Асабіста я не бачу падставаў, каб не пагадзіцца з В. Булгакавым, — сапраўды, насуперак цверджанням Святланы Куль-Сяльверставай, А. Смаленчука, А. Казакевіча і іншых, літвінская традыцыя не стварыла ні беларускага нацыянальнага руху, ні беларускай нацыянальнай ідэі. Але **Беларусь** ад самага пачатку свайго існавання ў складзе Расіі сцвярджалі, што беларусы — самастойны славянскі народ, і далучыліся да яго пазней. У кнізе В. Булгакава гэта паказана. Праўда, мне не зразумела, чаму В. Булгакаў прыніжае ў беларускім нацыягенезе ролю беларускіх народнікаў, выдаўцоў «Гомана»? Што ні кажыце, але яны стварылі першую палітычную праграму ў дачыненні да Беларусі, першымі абгрунтавалі яе права на нацыянальную дзяржаўнасць (у выглядзе аўтаноміі ў складзе Расіі), сцвярджалі, што беларусы цалкам самастойны славянскі народ, а не галіна ці складовая частка якой-небудзь іншай нацыянальнай супольнасці. Што да Францішка Багушэвіча, то няма сумненняў у тым, што *яго персанажы* Мацей Бурачок, Сымон Рэўка з-пад Барысава — то беларусы па нацыянальнасці. Прадмова да «Дудкі беларускай», безумоўна, насіла культурны беларускі характар, сцвярджала культурную, моўную самастойнасць беларускага народу, існаванне ў яго ўласнай гістарычнай традыцыі ў мінулым. Аднак ніводнага слова аб нацыянальнай будучыні, аб праве беларусаў на самастойную

[35] Нібыжкін В. И. Католицизм в современной Беларуси // Польская и католическая церкви в социально-культурных процессах современной Беларуси. Материалы круглого стола. Могилев, 2006. С. 78.

[36] Мяцельскага Н. Беларускамоўнасць насельніцтва Заходняй Беларусі: сацыяльна-палітычны аспект // Гістарычны альманах. Т. 8. Гродна, 2004. С. 152.

дзяржаўнасць у хоць якой форме, там няма. Ці лічыў сам Ф. Багушэвіч сябе беларусам? Тут ёсць поле для палемікі. І школы таемныя польскія адкрываў, за правы польскай мовы змагаўся, большасць сваіх твораў напісаў па-польску[37]. Дзеці ягоныя, дарэчы, ніякіх праяваў беларускага нацыяналізму таксама не засведчылі. Выраслі «нармальнымі» палякамі.

Колькі слоў пра сучасных беларускіх літвінаў і літвінства. Калісьці, у свой час Фрыдрых Ніцшэ, крытыкуючы хрысціянства, сцвярджаў, што насамрэч за ўсю яго гісторыю быў толькі адзін хрысціянін — дый той сканаў на крыжы. *Бо ён жыў, як вучыў.* Перафразаваўшы, можна сказаць, што я ведаю толькі аднаго чалавека ў Беларусі, які сапраўды імкнецца жыць як літвін, у рэчышчы сармацкай традыцыі. Гэта Алесь Бацвін, і ён мае на гэта права. Яго туга па літвінстве, замілаванне літоўскімі традыцыяй — то туга па шляхецкім засценку, туга па тым часе, калі высакародства магло спалучацца (і спалучалася) з грамадзянскай і эканамічнай актыўнасцю, высокай прававой культурай, адукацыяй — і гэта справа, што, як ні круці, польскія абшарнікі Беларусі ніколі не збіраліся будаваць асобную дзяржаву польскамоўных літвінаў. Спробы ж паказаць «Сярэднюю Літву» Жалігоўскага як дзяржаўны праект гэтых самых літвінаў — бяздоказныя і не верыфікуюцца крыніцамі. Юзаф Пілсудскі (можа, таксама літвін, а не паляк?) інспіраваў і блаславіў гэтую справу і той мэты, дзеля чаго ўсё гэта было зроблена, — дамогся. Віленскі край увайшоў у склад Польшчы, без усялякай, дарэчы, аўтаноміі. Вось такая дзяржаўнасць… І Заходняя Беларусь у складзе Польшчы не была аўтаномнай адзінкай, не звалася ні Літвой, ні Беларуссю, а Крэсамі, Усходняй Польшчай. Беларускія АКоўцы таксама змагаліся за незалежнасць і непадзельнасць Польшчы ў межах 1939 г., а не за нешта іншае, не за польскамоўную Літву ці літвінства…

Прыгадайма на заканчэнне выраз, які любіць паўтараць гісторык Алег Латышонак — фальшывая гісторыя нараджае фальшывую палітыку.

[image]
[image]

[37] Radzik, R. Miejsce zbiorowości etniczną a kwestia narodowa. Lublin, 2000. S. 125, 239—241.

[38] Ведаю гэта не толькі як гісторык, а яшчэ як і нашчадак (па маці) ганаплівай мсціслаўскай шляхты. Ведама, каталіцкай і польскамоўнай.

№ 1-2 (64-65) 2008
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2008/06/17**
[image]

Алесь Смалянчук

Тэма, якая можна працягваць

Arche. 2007. № 7 (58) – 59).

Зрэшты, у кожным даследаванні ёсць недахопы. Агульную ацэнку навуковаму даследаванню дасць час і далейшае развіццё навукі ў дадзеным выпадку беларускай гуманістыкі. Безумоўным плюсам кнігі В. Булгакава з'яўляецца прыцягненне ўвагі да вытокаў беларускага нацыяналізму. Нягледзячы на пастаўленыя пытанні і выказаныя заўвагі, яна з'яўляецца цікавым канцэптуальным даследаваннем праблемы.

Дыскусія працягваецца, і я вельмі ўдзячны В. Булгакаву за прадстаўленую магчымасць пазнаёміцца з дасланым у рэдакцыю артыкулам магілёўскага археолага і гісторыка Ігара Марзалюка «Сімптомы «пажаданай гісторыі». Артыкул варты рэплікі хоць бы з прычыны важнасці адстойвання крытэраў навуковага прафесіяналізму.

Адразу заўважу, што не збіраюся разбіраць усе прыведзеныя

«доказы» «беспаваротнай» польскасці літвінаў XIX стагоддзя і «міфалагізаванасці гістарычнай свядомасці часткі беларускай нацыянальнай эліты». Навуковыя даследаванні большасці вышэй названых беларускіх аўтараў самі сабою з'яўляюцца добрым адказам Ігару Марзалюку.

Хачу звярнуць увагу на спосаб доказу ўласнай пазіцыі, якім карыстаецца магілёўскі археолаг. Цытаты з літаратурных і публіцыстычных тэкстаў Адама Міцкевіча, напісаных у розныя часы, перамяжоўваюцца з цытаваннем польскага палітыка канца XVIII стагоддзя Гуга Калантая, польскага пісьменніка і публіцыста першай паловы XX стагоддзя Юзафа Мацкевіча ды інш. Тут жа можна пазнаёміцца з цытатамі з навуковых працаў Рышарда Радзіка і Юліюша Бардаха, якія нечакана становяцца амаль што аднадумцамі. Уся гэтая мяшанка людзей і эпохаў сведчыць не пра навуковы пошук, а пра імкненне аўтара ўсімі сродкамі давесці ўласную правату. Відавочная спроба маніпулявання чужымі тэкстамі. Міжволі згадваецца вядомая фраза Лё Гофа наконт таго, што самы агідны від хлусні — гэта хлусня з дапамогай гістарычных фактаў…

Непрафесіяналізм магілёўскага археолага ў тым, што ён прыводзіць цытаты, вырываючы іх з кантэксту ўсяго дакументу, ігнаруючы як абставіны яго ўзнікнення, так і сам гістарычны кантэкст XIX стагоддзя[7]. Не займаючыся даследаваннем гісторыі XIX стагоддзя, Марзалюк тым не менш папракае сваіх апанентаў у «крыніцазнаўчай недасведчанасці»?!

Тое самае датычыць цытавання іншых даследчыкаў. Знаёмства з тэкстамі Юліюша Бардаха, асабістыя сустрэчы і размовы з вядомым польскім даследчыкам дазваляюць заявіць, што, насуперак сцвярджэнню Марзалюка, ён не лічыць беларускую ліцвінскай шляхты другой паловы XIX стагоддзя «нацыянальнымі палякамі». Дарэчы, менавіта Ю. Бардах адным з першых звярнуў увагу на феномен краёвасці, актыўную прысутнасць якога ў палітычным і культурным жыцці Беларусі пачатку XX стагоддзя сведчыць пра адметнасць і своеасаблівасць нацыянальнай самаідэнтыфікацыі шырокіх колаў каталіцкага грамадства беларускіх земляў.

[7] Знаёмства з тэкстамі Ігара Марзалюка дазволіла ўпэўніцца ў тым, што ён не валодае ні польскай, ні беларускай мовамі, а таму з ягонай навуковай спадчынай можна знаёміцца толькі ў перакладах.

Недакладна пераказаная таксама пазіцыя аўтара гэтых радкоў.

У сваіх галоўных працах я імкнуўся абгрунтаваць гіпотэзу пра ліцвінскае паходжанне беларускага нацыянальнага руху, а пра тое, што ліцвінства разам з заходнярускай культурнай традыцыяй адыгрывалі прыкметную ролю ў працэсе беларускага культурнага назапашвання і тым самым прычыніліся да нараджэння ўласна беларускай культурнай традыцыі ў другой палове XIX стагоддзя[8]. Сцвярджэнне Марзалюка, што я даказваў, нібыта ліцвінская традыцыя стварыла беларускі нацыяналізм, не адпавядае рэчаіснасці.

Аргументы Марзалюка таксама сведчаць, што для археолага з Магілёва няма ніякай розніцы паміж эпохай і людзьмі XIX стагоддзя і XX стагоддзя, а таксама паміж нацыянальнай тоеснасцю каталіцкага насельніцтва Беларусі гэтых двух стагоддзяў. Гісторыя для Марзалюка быццам спынілася. Відаць, менавіта таму Касцюшка і Міцкевіч характарызуюцца як «творцы» мадэрновай польскай ідэнтычнасці (?!)[9], а вельмі спрэчная характарыстыка сучаснай польскай супольнасці Гродзеншчыны і разважанні наконт вынікаў перапісу 1999 году становяцца аргументам на карысць польскасці каталіцкага насельніцтва Беларусі XIX стагоддзя.

Імкненне Марзалюка даказаць «беспаваротную» польскасць ліцвінаў і ўсяго каталіцкага насельніцтва беларускіх земляў XIX стагоддзя прымушае згадаць тэзісы іншага магілёўскага аўтара Якава Трашчанка. Таксама вельмі паважанага. Праўда, не ў навуковых колах… Вось, напрыклад, што ён пісаў у сваёй «Истории Беларуси»:

В определённых кругах очевидно стремление выдать «кресовую» польскую культуру за этнически белорусскую. Характерно, что и сами носители этой культуры, и их потомки (…) нисколько не заблуждаются на этот счёт, имея чёткую польскую самоидентификацию. Единичные заигрывания польских помещиков с «тутейшими» традициями всегда носили демагогический х-р… Польская культура на территории Беларуси типологически ничем не отличалась от польской шляхетской культуры других регионов бывшей Речи Посполитой[10].

Беларускае нацыянальнае адраджэнне (Х–ХVІІІ стагоддзі) // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мінск, 2003. Вып. 1. С. 3–14.

Таксама прачытаць рэцэнзію на яе: Сагановіча (Прывід нацыі у імгле стэрэатыпаў // Беларускі гістарычны агляд. 2003. Т. 10, сш. 1—2 (18—19). Апошнюю лічу адным з найлепшых тэкстаў гэтага жанру ў беларускай гістарыяграфіі. Дарэчы, Г. Сагановіч звярнуў увагу на спробу І. Марзалюка пад выглядам

нейкай «метаэтнапалітычна супольнасці» рэанімаваць савецкую ідэалагему «старажытнарускай народнасці».

[8] Больш падрабязна пра гэта гл. у кнізе «Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917 г.» (Выд. 2-е. Санкт-Пецярбург, 2004), а таксама ў шэрагу артыкулаў.

[9] У якасці «творцаў» мадэрнай нацыянальнай ідэнтычнасці ў польскай гістарыяграфіі звычайна фігуруюць постаці канца XIX — пачатку XX ст., у прыватнасці Раман Дмоўскі ды інш.

Падабенства пазіцыі Марзалюка з поглядамі сучасных прадстаўнікоў «заходнерусізму» праяўляецца таксама ва ўжываных ім у зняважлівым сэнсе тэрмінах «шчыраадраджэнская», «нацыянальная» (resp = нацыяналістычная), «адраджэнцы», «адраджэнскі варыянт гісторыі». Я. Трашчанок таксама актыўна зневажаў ужываныя ім апанентаў тэрмінам «возрожденцы». Аналагічна рабіў у публікацыях другой паловы 90-х гг. прафесар Гродзенскага універсітэта Валеры Чарапіца. Зрэшты, магілёўскі аўтар таксама абураецца тэрмінамі, якія выкарыстоўваюцца г. зв. гісторыкамі-«адраджэнцамі». У іх пералік трапіў нават тэрмін «дырэктыўная гістарыяграфія», які быў ужыты у маёй крытычнай рэцэнзіі на «Историю Беларуси», галоўным аўтарам якой быў Якаў Трашчанок…

[10] Трашчанок, Я. История Беларуси. В 2 ч. Ч. 2. Могилев, 2005. С. 151

Пры бліжэйшым разглядзе «ідэалагічная рэвалюцыя» аказалася толькі малапераканаўчай спробай мадэрнізацыі «бээсэсэраўскай» ідэалогіі. Адным з «наватарскіх» элементаў стала ідэалогія абноўленага «заходнерусізму», якая актыўна пацясніла дамінантную раней дактрыну вялікадзяржаўнага расейскага шавінізму. Магчыма, якраз «вецер» ідэалагічных пераменаў падштурхнуў І. Марзалюка да ўдзелу ў дыскусіі.

[image]

[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 1-2 (64-65) 2008
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2008/06/17
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2008/06/18
[image]

Андрэй Вашкевіч.

Што ж тычыцца канкрэтных палітычных вынікаў, дык[redacted] ніводная з пастаўленых 25 сакавіка мэтаў у той момант не была дасягнута, калі не лічыць перспектываў фінансавай падтрымкі беларускага ўраду з боку Украіны. У канцы кастрычніка 1918 года газета «Минский голос» здзекліва канстатавала:

Имеет ли право на существование, должна ли и может ли быть основана «Белорусская республика»? Покажется легкомысленным — даже неуместной шуткой — ответ, выраженный в форме вопроса: а почему нет? Но это вовсе не хлестаковское благодушие («пусть называется»!). И совсем не пустое балагурство. Совершенно серьезно! А почему нет? Если есть самостоятельная Украина, вольный Дон, Грузия, Крымская республика, Кубань, Закавказская и Азербайджанская республики, если будут Литва и Латвия — то почему не быть Белоруссии? Совсем не нужно для утверждения права на существование автономной Белоруссии всего того, что дает развертывающееся перед нами так называемое «национальное движение» белорусов… Определенно бездарна и смешна вся книжно-водевильная «государственность» современных белорусских деятелей. Вся «Рада» производит впечатление захудалой любительской труппы, и все «государственное строительство» нынешних белорусских вождей напоминает растерянность, беспомощность, переплетенную личными обидами и интригами, суетливость провинциального спектакля… Это будет здание из карт, из бумажных карт, которые разлетятся во все стороны при первом дуновении ветра[4].

3. Mielešk Barkawańnie dzieržaunaha ładu // Kolas. 1918. 03 красавіка.

Апошнія словы аўтара артыкула ў «Минском голосе» з Мінскім
па-праросцу спраўдзіліся, калі вясной 1919 года міністры 1918.
у Гародні сабраліся на апошнюю нараду перад тым, як выехаць
за межы Беларусі. Першую гадавіну таго памятнага сустрэчнага
ранку гарадзенскія беларусы адзначылі адразу некалькімі
святочнымі вячэрамі.

Спачатку ў клубе «Беларуская хатка» адбываецца ўрачысты вечар у гонар Беларускага ўрада. У прызначаны час усе пакоі клуба запоўніліся прадстаўнікамі самых розных слаёў насельніцтва Гародні. Першым выступіў Антон Луцкевіч з заклікам не кідаць працы на нацыянальнай ніве да часу, пакуль Беларусь не стане незалежнай. Пазней слова ўзяў прадстаўнік ППС, папрасіўшы прабачэння за тое, што не ведае беларускай мовы: «Для мяне Беларусь, — гэта другая Радзіма, бо я тут нарадзіўся на свет». Ён паабяцаў, што польскія сацыялісты зробяць усё, каб Беларусь стала незалежнай дзяржавай, аднак дадаў: «Мы прывядзём Беларусь да незалежнага жыцця як рэспубліку, братнюю для Польшчы». Пасля гэтага адзін з прысутных беларускіх дзеячаў — Антон Борык падняў тост: «Няхай жыве Беларусь з Польшчай!» Шмат хто з прысутных падтрымаў А. Борыка і, падняўшы чаркі ў бок паляка, выпілі іх. Гэта не спадабалася сябрам Гарадзенскай беларускай управы Я. Курлову, К. Езавітаву і прадстаўніку яўрэйскай супольнасці, «нейкаму яўрэйскаму прафесару». Ужо трохі падпіўшы, прафесар заявіў, што Беларусь да гэтага часу ніколі не была незалежнай, таму беларусы зробяць вялікую справу, калі здолеюць дамагчыся ад іншых народаў прызнання ўласнай дзяржаўнасці. Гэтыя словы аспрэчыў Б. Кваціпскі, былы выкладчык беларускай настаўніцкай семінарыі ў Свіслачы, прызначаны Міністэрствам беларускіх спраў школьным інспектарам у Гародні. Б. Кваціпскі даводзіў, што Беларусь не толькі была незалежнай, але нават клапацілася пра іншыя дзяржавы, такія, як Літва, і толькі саступіла ўплывам польскай культуры.

Дарма што вячэра адбывалася ўсяго праз тыдзень пасля смерці настаўніка мясцовай беларускай школы А. Грыкоўскага, атрымалася яна вельмі вясёлай і абышлася амаль што ў 5 тысяч острублёў. Ужо 23 сакавіка А. Луцкевіч, А. Смоліч, А.

Цвікевіч, Л. Заяц і А. Галавінскі выехалі з Гародні[5].

25 сакавіка, першую гадавіну абвяшчэння БНР, мясцовыя беларусы адзначылі больш сціпла, запрасіўшы «на бацькаўшчына. памяшканне беларускага камітэта ўдзельнікаў наступнага з'езда ды іншых гасцей. У якасці старшыні Беларускага цэнтральнай Рады Гарадзеншчыны вячэру распачаў П. Аляксюк, прачытаўшы першую ўстаўную грамату Рады БНР, пасля чаго прысутныя праспявалі беларускі гімн. З прамовамі выступілі Б. Квяцінскі, Я. Натусевіч і іншыя. Б. Квяцінскі між іншым сказаў:

[5] Бацькаўшчына. 1919. 8 красавіка.

Сягодня вітаючы адраджэньне нашай дарагой, змучанай даўгой няволяй бацькаўшчыны, б'ецца маё сэрца ад радасьці. Разумею, тое ж самае і з вамі. Дарагія таварышчы, вучыцялі і вучыцелькі, на вашых плячах ляжыць далейшая праца ў кірунку адраджэньня. Мы ня маем аружжа, ды што аружжа бяз духу, без нацыянальнай сьвядомасьці — гэта цела без душы. Вы творцы гэтага духу, духу нацыянальнай сьвядомасьці, сяліці яго ў сьвятынях — у сэрцах малых анёлак дзетак, а створыце той дух, каторага не здалеюць нашы ворагі[6].

Адначасова 25 сакавіка, хутчэй за ўсё ў памяшканні «Бацькаўшчына», адбылася развітальная вячэра з нагоды ад'езда былога першага старышыні Народнага сакратарыята БНР, а цяпер міністра беларускіх спраў пры Літоўскай Варонкі[7].

[6] Беларусь. 1919. 2 красавіка.; Беларуская думка (Вільня). 1919. № 2, с. 4, 5.

Другая гадавіна абвяшчэння незалежнасці прыпала на час польскай акупацыі і працяглага палітычнага крызіса, які прывёў Раду БНР да расколу. На паседжанні Мінскага Беларускага нацыянальнага камітэта 22 сакавіка 1920 года першым разглядалася пытанне аб святкаванні

[7] Бацькаўшчына. 1919. 8 красавіка.

Нацыянальнага сьвята 25 сакавіка, абвяшчэньне Радай Беларускай Народнай Рэспублікі Незалежнасьці Беларусі ў яе этнаграфічных межах… У сувязі з тым, што па незалежным ад Камітэту варункам у сучасны момант немагчыма сьвяткаваць так, як трэба было б, сьвяткаваньне адкладаецца на неазначаны тэрмін да таго часу, калі гэта будзе магчыма. А 25 сакавіка,

дзеля важнасьці момэнту, абмежавацца гэтакім сьвяткаваньнем: а) ува ўсіх беларускіх школах і прытулках а 11-й гадзіне зрана сабраць усіх вучняў гэтых школ і іх бацькоў, а дзяцей прытулкаў у прытулках, дзе павінны быць зроблены прамовы кіраўнікамі аб значэньні гэтага сьвята (устаўная грамата ад 25 сакавіка 1918 году), затым вучні ўсіх школ і дзеці прытулкаў, а па мажлівасьці і іх бацькі, пасылаюцца пад кіраўніцтвам настаўнікаў на набажэнства — каталікі а 12-й гадзіне ў касьцёл, а праваслаўныя — а 1-й гадзіне ў царкву, а пасьля набажэнства яны адпускаюцца дамоў. Затым а 4-й гадзіне па поўдні у «Беларускай Хатцы» робіцца для дзяцей дзіцячы спэктакль, куды так сама павінны быць прыведзены дзеці. Усе дзеці павінны быць уквечаны папяровымі нацыянальнымі значкамі. Выпаўненьне ўсяго гэтага прасіць Беларускую Школьную Раду і Настаўніцкі Саюз. б) А 5-й гадзіне ў вечары ў памешканьні Беларускага Нацыянальнага Камітэту (б. Юбіл. Дом) адбудзецца Урачысты Сход Нацыянальнага Камітэту. Дзеля чаго на гэты сход прасіць усе арганізацыі, а так сама і вайсковую Камісію, каб яны прыслалі сваіх прадстаўнікоў з мандатамі лікам да 5-ці асоб ад кожнай. в) А 7-й гадзіне ў вечары будуць пастаўлены беларускія п'есы: у мяйсцовым тэатры будзе пастаўлена п'еса з выступам хору, пры чым партэр і першы ярус будуць платнымі, 2-і ярус бясплатны для беларускіх арганізацыяў і 3-і на палову платны, на палову бясплатны, для сьвядомых беларусоў, а ў «Беларускай Хатцы» Таварыствам Працаўнікоў Беларускага Мастацтва будзе пастаўлена п'еса і інш. Уход бясплатны, але па білетам. На выдаткі па ўстройству спэктаклю ў «Хатцы» Таварыству Мастацтва Камітэт выдае 750 марак. г) Прасіць рэдакцыю газэты «Беларусь» па мажлівасьці, але ня вельмі відавочна, зьмяшчаць у газэце артыкулы аб значэньні сьвята, а ў дзень сьвята выпусьціць юбілейны нумар[8].

І гэтым разам ізноў вызначылася Гародня. Тут 27 сакавіка 1920 года ў памяшканні клуба «Беларуская хатка» адбылося святкаванне другой гадавіны абвяшчэння незалежнасці БНР. Пасля беларускага гімна выступіў старшыня Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэта Я. Натусевіч. Затым слова ўзялі Л. Дзекуць-Малей і тагачасны старшыня Грамады беларускай моладзі С. Баран, пасля чаго хор праспяваў

[8] Устаўная грамата ад 25 сакавіка 1918 года // Беларускі архіў. — Т. 1. — С. 11.

некалькі нацыянальных песняў. «Наагул, — адзначаў ён, — «Беларусь», — вечар прайшоў вельмі добра і зрабіў на прысутных прыемнае ўражаньне»[9].

Толькі ў наступныя гады святкаванне 25 сакавіка набывае нацыянальны маштаб. З нагоды 3-й гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларусі Рада БНР з Коўна склала шэраг адозваў. У звароце да жыхароў Беларусі Рада заклікала:

Народзе беларускі! Доўга і цяжка змагаўся ты за сваю зямлю і волю. Палілі твае вёскі, грабілі дабро, гналі ў турмах, катавалі і расстрэлівалі тваіх лепшых сыноў польскія паны — абшарнікі і маскоўскія наезднікі — камуністы. Зямлі табе не далі і самі ею не скарысталіся, а ты адзін толькі на яе маеш права. Мучылі і катавалі цябе толькі за тое, што ты бяроg свой хлеб для сябе і сваіх галодных дзяцей, а не аддаваў яго польскім і маскоўскім наезднікам. Сёмы год на тваёй зямлі ідзе безупынная барацьба, ужо мусіць няма ніводнай пядзі зямлі, не палітай крывёю. Ты моцна стаў і стаіш за сваю незалежнасьць і сваю беларускую ўладу… Чакай распараджэньня свайго Ураду, які хутка павінен вывясьці з няволі — гуртуйцеся і чакайце. Шчыльнымі брацкімі радамі пайдзем вызваляць сваю Бацькаўшчыну, калі гэта будзе трэба, Праўда за намі, сваю зямлю не аддадзім нікому. Лепш загінуць, чым быць батраком чужынцам

[10].

У дэкларацыі ўрада БНР з той самай нагоды акцэнты таксама былі пастаўлены на дасягненне рэальнай дзяржаўнай незалежнасці краіны:

Тры гады мінула ўжо ў безупыннай барацьбе. За гэты час на нашай зямлі гаспадарылі і гаспадараць варожыя сілы. Пераходзячы з краю ў край праз нашу Маці — Беларусь чужацкія войскі палілі вёскі, руйнавалі гарады, пакідаючы за сабой голад і смерць… Але моцна трымае Рэвалюцыйны Беларускі Урад у сваіх руках сьцяг незалежнасьці і непадзельнасьці роднага краю. Пад

Бутрым Тамака, Козіч і Фарботка / Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). Ф. 368. Воп. 1. Спр. 24. Арк. 1—10 адв.

[9] З нагоды сьвяткаваньня 25 сакавіка // Спадчына. 1998. № 1. С. 38—39.

[10] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей — БДАМЛіМ). Ф. 3. Воп. 1. Спр. 243. Арк. 153.

гэтым сьцягам аб'ядналіся лепшыя сыны Беларусі, за гэты сьцяг аддавалі яны жыцьцё, за волю народу гнояцца яны ў канцэнтрацыйных лагерах і турмах бальшавіцкіх і польскіх. З гэтым сьцягам прадстаўнікі Ураду ішлі заграніцу і голасна пратэставалі перад Урадамі сьвету і перад мільённым народам Эўропы супраць зьдзеку і гвалтаў чужакоў у родным краю. Усюды, дзе толькі білася сэрца сыноў Беларусі, ва ўсе куткі Беларусі Урад пасылаў словы надзеі, загады барацьбы за сваю праўду… Пад сьцягам БНР, па загаду свайго ўраду бійся за вольную і незалежную Беларусь, за яе непадзельнасьць, за сваю зямлю і волю. Добра ведай, што ў барацьбе тваёй разарвецца ярмо, якое накідаюць чужакі на тваю галаву, згінуць граніцы, якімі хочуць падзяліць бацькоў ад сыноў, дзяцей ад маці. Недалёк ужо той дзень, калі ты вольны загаспадарыш у сваёй вольнай дзяржаве[11].

Асобна быў надрукаваны зварот Рады і ўраду БНР да беларускага яўрэйства з нагоды трэцяй гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларусі:

[11] БДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 243. Арк. 150.

Грамадзяне! Мы цьвёрда верым, што ў гэтым вялікі дзень на ўсёй зямлі кожнае чэснае беларускае сэрца бьецца разам з намі і разам з намі кліча: Слава Беларускай Народнай Рэспубліці! Няхай жыве Беларуская Незалежнасьць![12]

Гэткую асаблівую цікавасць да яўрэйскага насельніцтва можна вытлумачыць надзеяй на падтрымку з боку яўрэйскай супольнасці беларускага пытання на міжнародным узроўні.

[12] БДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 243. Арк. 149.

Хоць у гэты час урад БНР на чале з В. Ластоўскага ўсё яшчэ працягваў адыгравать пэўную ролю, усё ж такі пачынаючы з 1921 года цэнтрам святкавання Дня Незалежнасці становіцца Вільня. На працягу наступных чатырох гадоў святкаванне 25 сакавіка ўсе віленскія беларускія арганізацыі праводзілі разам, што падкрэслівала адзінства беларусаў розных палітычных арыентацый у імкненні да незалежнасці.

25 сакавіка 1921 года ў Вільні адбылося ўрачыстае паседжанне Беларускага нацыянальнага камітэту, на якім прысутнічалі і выступілі А. Луцкевіч, А. Смоліч, кс. Ад. Станкевіч, М. Гарэцкі.

Праз некалькі дзён, 29 сакавіка, насуперак рэкамендацыям каталіцкіх ерархаў, у маленькім віленскім Браніфратэрскім касцёле ксёндз Адам Станкевіч правёў урачыстую імшу, якую завяршыў казаннем на беларускай мове.

Дзень гэты вялікі і гістарычны. У гэты дзень падчас набажэнства ў касьцёле, першы раз у Вільні (ня кажучы аб старадаўніх часах) пяяліся беларускія песьні, а пасьля гаварылася беларускае казаньне. Боніфратэрскі касьцялок быў блізу перапоўнены. Настрой ва ўсіх паважны і радасны. Па ўсім хор беларускіх дзетак адпяяў «Божа, што калісь народы…»

— так апісаў гэтую падзею адзін са сведкаў[13].

Урачыстае набажэнства, прысвечанае 25 сакавіка, стала[13] Крыніца. самай трывалай традыцыяй святкавання Дня Незалежнасці 1921. № 10. ўсё міжваеннае дваццаціголддзе. Толькі адбывалася яно ў пазнейшыя гады ў віленскім касцёле святога Мікалая, які належаў літоўскай супольнасці і дзе беларусы кожную нядзелю маліліся на роднай мове. Як правіла, імшу праводзіў ксёндз Адам Станкевіч, часам С. Глякоўскі ці іншыя святары.

На чацвёртую гадавіну абвяшчэння Незалежнасці ўрад БНР падрыхтаваў чарговы мемарыял, у якім, паміж іншым, гаварылася:

Выбраны Радай Беларускай Народнай Рэспублікі Урад праз увесь час моцна трымаў у сваіх руках сьцяг змаганьня за незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі. Але найбольш яскрава выявілася імкненьне беларускага народу да волі і незалежнасьці падчас паўстаньня ў Случчыне ў лістападзе і сьнежні 1920 году. Нягледзячы на тое, што Слуцкае паўстаньне было задушана з двух бакоў, гэта ёсць: маскоўскімі і варшаўскімі імпэрыялістамі — яно застаецца пуцяводнай зоркай у гісторыі беларускага вызваленча-адраджэнскага і дзяржаўна-незалежніцкага руху. Твая доля ў тваіх уласных руках. Справа вызваленьня і адраджэньня тваёй Бацькаўшчыны — гэта ёсць справа тваіх мазольных рук. Цясьней гуртуй свае рады пад сьцяг змаганьня за

волю і незалежнасьць тваёй Бацькаўшчыны. Адзінай арганізаванай грамадой магутны дай адпор тваім крыўдзіцелям. Толькі ў еднасьці і арганізаванасьці наша моц і сіла. Неарганізаваныя выступленьні павінны быць спынены. Больш веры ў сябе, у свае сілы! Сьвяткуючы чацьвёртую гадаўшчыну абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі моцна верыць у творчы розум беларускага народу і заклікае стаць у рады актыўных змагароў усіх тых, хто ня хоча быць нявольнікам, хто сваё жыцьцё гатоў аддаць за волю і незалежнасьць Бацькаўшчыны[14].

Пасля выбараў 1922 года і з'яўлення беларускага прадстаўніцтва ў польскім парламенце пытанне аб незалежнасці атрымала зусім нечаканае гучанне.

[14] Беларускі сьцяг. 1922. № 1. С. 22—23.

Народ Беларускі мае выразныя незалежніцкія тэндэнцыі, — заявіў Браніслаў Тарашкевіч выступаючы у студзені 1923 года ў польскім Сейме, — незалежнасць гэтую глыбока ў сэрцы хаваем і пястуем, але з'яўляемся лаяльнымі грамадзянамі Польскай Дзяржавы, іначай кажучы, разумеем гэтую справу эвалюцыйна, а не рэвалюцыйна, — і людзей — сапраўдных патрыётаў, людзей сумленных, гэта павінна задаволіць[15].

Гэтыя словы былі, напэўна, найбольш удалым прытарнаванем незалежніцкага ідэалу да новай палітычнай сітуацыі, калі палітычная і эканамічная стабілізацыя адсоўвала ў новага тэрытарыяльнага перадзелу кантынента (а такім магла з'явіцца незалежная Беларусь) на больш адлегласьць перспектыву. Гэта адчувалі і польскія ўлады і насельніцтва Заходняй Беларусі.

[15] Тарашкевіч Б. Выбранае: Крытыка, публіцыстыка, перакла ды. Мн., 1991. С. 81.

Мясцовае аседлае насельніцтва, — гаварылася у рэфераце II аддзела ДОК III ад 18 ліпеня 1922 года, — *ужо мае досыць усялякай няпэўнасці, тады як перспектыва новай вайны ці нейкіх замешак на гэтым грунце пагражаюць ім канчатковай руінай таго, што яму пасля ўсіх войнаў засталося, ці што паспелі аднавіць… Аналіз агульнай сітуацыі паказвае беларусам адсутнасць рэальных асноваў для іх працы і перспектыву захавання гэткага стану бадай на некалькі год. Гэта*

падштурхоўвае беларускіх дзеячаў да «арганізацыйнай працы» над нацыянальнай самасвядомасцю беларускіх мас і павелічэннем беларускіх культурных здабыткаў. Мара пра Незалежнасць, пра Незалежнасць Беларусі, зыходзіць з парадку дня, губляючы адпаведнасць бягучаму моманту[16].

Адначасова расла і прыхільнасць заходнебеларускага насельніцва да БССР. Апошняе адбілася і ў стаўленні да святкавання дня 25 сакавіка. Адзначаючы 6-я ўгодкі Незалежнасці, А. Станкевіч пісаў на старонках «Крыніцы»:

Ідэал незалежнасьці Беларусі, хоць не ва ўсёй поўні, але ўжо спаўняецца ў жыцьці. За апошнія некалькі месяцаў гэтага году большасьць беларускіх зямель на ўсход ад граніц цяперашняй Польшчы ўжо аб'яднаны ў Беларускую Савецкую Рэспубліку ў фэдэрацыі з Расеяй. Беларусь — ужо дзяржава. Гэта факт, якога пярэчыць нельга і якога ўжо ніякая сіла са старонак гісторыі ня вымажа. За шэсьць гадоў ад часу 25 сакавіка 1918 года ідэал незалежнай Беларусі прынамсі ў асновах сваіх спраўдзіўся ў жыцьці. Адзін з важных аддзелаў жывой кнігі Незалежнай Беларусі ўжо напісаны. Сёмы год абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі — новы аддзел яе. Што далейшая наша гісторыя на старонках новага аддзела ўпіша — згадаць нятрудна. Зьмест гэтых страніц безумоўна будзе дапаўненьнем папярэдняга аддзелу жывой кнігі Незалежнай Беларусі. Мы ў гэта моцна верым[17].

Апошні раз супольна віленскія беларусы адзначылі дзень 25 сакавіка ў 1925 годзе. У той год святкаванне выраслі ў шырокае спалучыць з юбілеем выдавецкай дзейнасці Францыска Скарыны ў Вільні[18]. У арганізацыі ўрачыстасцяў асаблівы ўдзел прыняло Беларускае навуковае таварыства, старшыней якога быў Антон Луцкевіч. У 8 гадзін вечара 25 сакавіка ў зале Віленскай беларускай гімназіі пачалося ўрачыстае пасяджанне таварыства, падчас якога прагучалі два даклады. «Век Скарыны» В. Тарашкевіча і «Жыцьцё і праца Фр. Скарыны» кс. Ад. Станкевіча[19].

У святкаванні заўсёды актыўна ўдзельнічалі патрыятычна настроеныя вучні Віленскай беларускай гімназіі і студэнты

[16] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 22, 25 ІІІ 1924 г.

[17] Krynica. 1924. 20 сакавіка.

[18] 400-годзе беларускага кнігадрукавання было шырока адзначана ў Беларусі і па-за яе межамі ў 1925 годзе. Толькі адзін-адзіны раз некалькі дзесяцігоддзяў была вядома, што Скарына выдаў сваю першую кнігу ў Вільні не пазней 1522 году.

[19] Krynica. 1925. № 12.

універсітэта Стэфана Баторыя. Як згадвала вучаніца Віленскай беларускай гімназіі А. Катковіч:

Дзень гэты быў для нас вялікім сьвятам. Перад абедам ішлі на малебен у касьцёл і царкву, а пасьля ў гімназію, дзе частавалі вучняў кавай і пончыкамі. Кожны з нас меў прышпіленую бел-чырвона-белую лентачку. Вечарам адбывалася ўрачыстая акадэмія, на якой прамаўляла многа асоб і былі чытаны тэлеграмы ад арганізацыяў розных народаў. У другой частцы акадэміі быў канцэрт[20].

Аднак ужо тады са сваёй уласнай інтэрпрэтацыяй сьвята выступілі беларускія паланафілы. Перш за ўсё яны акцэнтавалі ідэйную сувязь паміж актам Незалежнасці і той формай дзяржаўнасці, якая ўсталявалася ва Усходняй Беларусі. Так, А. Паўлюкевіча «Грамадзкі голас» у артыкуле «Сем Вераніка. ідэалу» пісала:

[20] К. Катковіч-Кулешэнка, Успаміны. Беласток, 1999. С. 33—34.

Сучасны лёс беларускага народу ўсім вядомы… Выйшаўшы з векавое маскоўскае няволі, з вастрогу народаў, якім была нябожчыца Расейская Імпэрыя, беларускі народ ня мог адразу падняцца вышэй сваіх магчымасьцяў. Заняпаўшы ў сваёй нацыянальнай культуры на працягу сталецьцяў, беларус ня мог асягнуць найвышэйшага свайго ідэалу — поўнага нацыянальнага самаазначэньня.

Вось чаму акт абвяшчэньня Беларусі незалежнаю народнаю рэспублікаю 25 сакавіка 1918 года ня меў у сваёй лёгічнай пасьлядоўнасьці поўнага практычнага значэньня, а зьявіўся цераз 9 з лішкаю месяцаў для бальшавікоў падставаю іх дыплёматычных экспэрымэнтаў.

Незалежным дзяржаўным жыцьцём кожны народ пачынае жыць толькі з таго момэнту, калі сярод яго насьпелі ўсе патрэбныя для гэтага жыцьця прадпасылкі або калі народ атрымае магутны штырх да самастойнага жыцьця звонку…

Рашучы акт 25 сакавіка 1918 года заўсёды будзе гістарычным момэнтам у жыцьці беларусаў, як-бы ні складаўся іх жыцьцёвы

шлях. У сучасны момант яго зьмест зьяўляецца ідэалам, які асягнены толькі на падставе бальшавіцкіх дэкрэтаў у форме гэтак званай «Соцыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь», створанай уладарамі маскоўскага Крэмля дзеля чыста палітычных мэтаў бальшавіцка-расейскай дыплёматыі.

Бальшавікі хітра скарысталіся фактам незалежнасьці Беларусі, хаця чэсьць гэтага пракламаваньня належыць ня ім, а дэмакратычнай беларускай інтэлігэнцыі… Ніякага нацыянальнага зьместу бальшавіцкая «беларуская» рэспубліка 1919 году ня мела… Гэткім чынам беларускі, абвешчаны сем гадоў назад, нацыянальны ідэал застаецца ў сутнасьці толькі ідэалам.

Аднак канчаўся артыкул даволі недвухсэнсоўнай высновай:

Дзеля асягненьня свайго нацыянальнага ідэалу ў невядомы час будучыны беларускаму народу трэба прайсьці цярністы шлях культурна-нацыянальнай творчасьці і, пры нармальных варунках польскіх конституцыйных гарантыяў, вечна трывалыя беларускія культурныя цэннасьці могуць быць выкаваны у межах Польскай Рэспублікі ня ў прыклад бальшавіцкаму экспэрымэнтатарству на Усходзе[21].

Перадача ў кастрычніку 1925 г. падчас канферэнцыі ў Берліне значнай часткай міністраў БНР сваіх міністэрскіх партфеляў урадам БССР, а таксама актыўнае нацыянальнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі, прывялі да таго, што сярод заходнебеларускай інтэлігенцыі пачала шырыцца думка, што ідэя БНР вычарпала сябе, а Заходняя Беларусь у перспектыве павінна стаць часткай БССР. Да гэтага асабліва схіляліся правадыры Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Менавіта таму на паседжанні Віленскага БНК, якое адбылося ў пачатку сакавіка 1926 года, было вырашана адмовіцца ад шырокага святкавання гадавіны незалежнасці Беларусі![22]

[21] Сцяг і голас. 1925. 25 кастр. № 1.

Антон Луцкевіч, непасрэдны удзельнік падзей 25 сакавіка 1918 года, фактычна далучыўся да групоўкі грамадоўцаў. Ці вырашылі 25 сакавіка гучна не адзначаць. У газеце «Дзянніца»

[22] ЦДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1.

«На Прадвесьні» ён размясціў артыкул пад назвай «Спрос на гадавіну», у якім пісаў:

Шмат каму выдавалася, што вось-вось трэба толькі, каб беларусы падалі аб сабе голас на міравой канфэрэнцыі ў Парыжу, і будзе ім і воля, і незалежнасьць… Але хутка іх спаткала цяжкае расчараваньне. Аказалася, што «дэмакратыі» Захаду, так многа гаварыўшыя аб праве народаў на самавызначэньне, на дзеле прызналі гэтае права толькі за тымі, за кім ім гэта было выгадна. Прызналі незалежнасьць Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі. Далі ім усялякую дапамогу, каб умацаваць іх дзяржаўны быт, ды надзялілі добрымі кускамі Беларускае і Украінскае зямлі, каб гэтыя васалы вялікіх заходніх дзяржаў за такія падаркі шчыра служылі ім у іх барацьбе з вялікай пагрозай буржуазнаму сьвету, якая ўзьнялася з Усходу. Так права беларускага і ўкраінскага народаў на самавызначэньне аказалася патаптаным заходнімі дэмакратыямі…

А тым часам на Усходзе рабіліся глыбокія перамены… На Усходзе пачалася новая эра ў нацыянальным пытаньні. І ідэя беларускага дзяржаўнага будаўніцтва, якую патаптаў «дэмакратычны» Захад, пачала рэалізавацца на Усходзе.

Мінулы год, калі так званы ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі зьліквідаваўся, закончыўшы гэтак сваё трагічнае бадзяньне па чужыне, — паказаў найлепш, як актыўныя беларускія адраджэнцы аднясьліся да гэтае новае эры.

Няма ніякага сумляваньня, што ў новым курсе радавае палітыкі адносна да беларусаў адыграў вялікую ролю акт 25 сакавіка 1918 года. Але гэты акт адыграў яшчэ вялікшую ролю ў прабуджэньні масавае самадзейнасьці, у так званай актывізацыі беларускага народу.

Заклікаючы ў «кірунку творчае нацыянальнае працы» да «сацыяльнага вызваленьня», аднаднёўка канстатавала:

Гэты сацыяльны ідэал ужо непадзельна запанаваў на Усходзе. Там толькі праз сацыяльнае вызваленьне перад беларусамі

адкрылася магчымасьць дзяржаўнага будаўніцтва. Там — і толькі там — беларуская дзяржаўнасьць сталася зьдзейсьненым фактам[23].

Іншую пазіцыю займаў адзін з лідэраў нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі ксёндз Адам Станкевіч. Ва ўмовах адноснай стабілізацыі палітычнай сітуацыі ў Еўропе існаванне беларускага ўраду на эміграцыі ў поўным складзе не мела практычнага сэнсу, аднак увасабленне ідэі незалежнасці Беларусі ў выглядзе эміграцыйнага ўраду БНР пад кіраўніцтвам Пятра Крачэўскага проста неабходна[24]. Менавіта таму беларускія хадэкі працягвалі лічыць святкаваць 25 сакавіка на працягу ўсіх 1920—1930-х гадоў.

[23] Цыт. па: Кароткі нарыс беларускага пытання // ARCHE. 2007. № 11. С. 356.

[24] Кароткі нарыс беларускага пытання // ARCHE. 2007. № 11. С. 356.

25 сакавіка 1926 г. адбыліся святочныя набажэнствы ў касцёле св. Мікалая і ў Пятніцкай царкве. Падчас казання кс. А. Станкевіч, між іншым, прамаўляў:

Так як Яўрэі гучна плакалі і цярпелі пасля ўтраты Сіёну, таксама і Беларусы, якія восем год назад абвясцілі незалежную Беларускую Народную Рэспубліку, аднак ня здолелі зьдзейсьніць гэтай ідэі, — плач і смутак носяць у сэрцах… Прыйшлі яны сюды, да Божага дому, каб прасіць Бога аб моцы дзеля ўвасабленьня свайго ідэала.

У артыкуле пад назваю «Двайное сьвята беларускага народу» газета беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў «Крыніца» пісала:

Рада Беларускай Рэспублікі, складзеная з найбольш выдатных, інтэлігентных і заслужаных прад беларускім народам дзеячоў, 25 сакавіка 1918 г. абвесьціла Беларусь Вольнай і Незалежнай, бо толькі такой, гаворачы па-людзку, можа быць яна шчасьлівай і толькі такой можа яна бараніць сябе ад вяковай крыўды, ад вяковага зьдзеку.

Але, каб вольнасьць і незалежнасьць здабыць, а здабыўшы ўтрымаць, трэба быць да гэтага адпаведна прыгатаваным, ці прасьцей кажучы, трэба, каб Народ Беларускі, як такі, разумеў

гэта і каб меў сваю беларускую культуру

25.

Свой погляд на ідэю нацыянальнай незалежнасці выказаў і Беларускі сялянскі саюз, на чале якога стаялі Ф. Ярэміч і В. Рагуля. Друкаваны орган партыі газета «Сялянская Звязда» адгукнулася на 8-я ўгодкі абвяшчэння незалежнасці БНР перадавым артыкулам, азаглаўленым «Стаўка на кайзэра, Пілсудзкага, Леніна». Сцвярджаючы, што «беларускі рух у сваім жыцьці, асабліва на пачатку, быў вельмі слабы», газета адначасова дадавала,

25 Кулініч В. 1926. 25 Вакавіка.

увесь гэты час ад пачатку рэвалюцыі аж да разгону беларускага кангрэсу трэба залічыць да найсьвятлейшых дзён беларускага руху. Тагды ўсе беларускія дзеячы арыентаваліся самі на сябе, або інакш кажучы на сілы самога Беларускага Народу.

Цяпер,

— працягвала «Сялянская Ніва», — *углядваючыся ў прошласьць, трэба прызнаць, што той разгон зьезду закончыў першую фазу і даў пачатак другой фазе беларускага руху, фазе арыентацыяў на чужыя сілы, бо свае былі слабыя. Беларускі рух, спаткаўшы на сваёй дарозе такую сярдзітую перашкоду, як камуністычная партыя, пачаў шукаць хаўрусьнікаў. Усякі вораг бальшавікоў лічыўся тады хаўрусьнікам беларускага руху…*

Мы прыходзім да пракананьня, што найгоршым злом для Беларусі, гэта будзе арыентацыя на чужынца, каторы нас хоча праглынуць. Найгідчэйшая ўгода будзе тады, калі годзішся з тым, хто цябе душыць. Стаўшы на свае ногі і адкінуўшы падняволныя і губячыя нас арыентацыі, мы будзем ісьці далей той дарогай, якою ішоў народ у 1917 годзе — дарогай арыентацыі на саміх сябе, або інакш кажучы — на сілы Беларускага Народу. І толькі гэткай дарогай, адкінуўшы службу ў усіх нашых багатых і дужых дзядзькоў, мы ўвойдзем у хаўрус і сям'ю незалежных і вольных народаў. Дык па стаўцы на кайзэра, Пілсудзкага і Леніна павінна прыйсці апошняя стаўка: на самых сябе!

У 1927 годзе беларускае грамадзянства, зацягнутае ў справу на падзей, звязаных з разгромам БСРГ, на чарговую гадавіну амаль не звярнула. Шмат каму здавалася, што гісторыя, менавіта тут і цяпер, што менавіта фантастычны ролік наступны разгром БСРГ, арышты яе правадыроў з'яўляюцца куды больш рэчаіснымі ўвасабленнямі нацыянальнай чым міфічная незалежнасць, абвешчаная дзевяць гадоў акупаваным немцамі Менску. Таму дзевятыя ўгодкі абвяшчэння Незалежнасці прайшлі даволі сціпла, больш нагадваючы закрытае мерапрыемства, калі не лічыць той факт, што арганізавалі іх разам Сялянскі Саюз і БХД[27].

[26] Сл. ўвагі Пыхтіна, Дзеніна // Сялянская Ніва. 1926. 21 ўстаўка.

Амаль адразу грамадоўскі гумарыстычны часопіс «Маланка» з нагоды дня 25 сакавіка змясціў даволі красамоўныя характэрнымі каментарамі. Першы — «Сьвяткаваньне «незалежнасьці» Беларусі» суправаджала вытрымка з мясцовай газеты аб тым, што «а 7 гадз. вечара ў салі «Жорж» адбылася ўрачыстая акадэмія. З прамовамі выступалі паслы Ярэміч, Рагуля і інш.» Пад цытатаю на малюнку селянін на холадзе гледзячы праз шыбу на балюючых у рэстаране з нагоды свята беларускіх дзеячоў разважаў: «Нішто сабе, добрая незалежнасьць! Відаць, паны ад нас сялянаў зусім аднезалежніліся, бо ніводнага з нас там і няма».

[27] Зарэцкі Narodowiec. 1927. № 2. S. 161

На другім малюнку — «Як сьвяткавалі дзень 25-га сакавіка,» было два абразкі: «сынкі» (у Вільні) — дзеячы БХД і Сельсаюзу падымалі тосты за сталом, тады як лідэры БСРГ — «пасынкі» (у турме ў Вронках), выглядалі з-за крат[28].

[28] Маланка. 1927. № 5. С. 4.

Святкаванне юбілею — дзесяцігоддзя абвяшчэння Незалежнасці БНР — супала адразу з некалькімі судовымі працэсамі над беларускімі дзеячамі ў Польшчы. Таму, выглядае больш чым сімвалічна, што, выступаючы у канцы лютага 1928 г. на працэсе па справе В. Рагулі ў Наваградскім судзе ў якасці адваката вядомы беларускі паланафіл П. Аляксюк адзначыў:

Імкненьне да незалежнасьці, нават гутарка аб ёй і прызыў да яе, як да астатняга найвышэйшага ідэала палітычнага існаваньня кожнага народу, не ёсьць прэступленьне проціў лаяльнасьці. Дзеля чаго і выкрык Рагулі, калі б ён нават і ўзапраўду закрычаў:

«Няхай жыве незалежная Беларусь!», ня мае ў сабе прызнакаў прэступленьня[29].

Як і раней, «Беларуская Крыніца» змясціла з нагоды дня Незалежнасці на першай старонцы святочны артыкул-зварот загалоўкам «На 10-я ўгодкі» з кароткім пераказам гісторыі абвяшчэння акта 25 сакавіка:

Дзень гэты ёсьць адной з найсьвятлейшых старонак гісторыі Беларусі. 25 сакавіка сёлешняга году мінае дзесяць гадоў ад дакананьня гэтага вялікага гістарычнага акту, спаўненьня якога нам дагэтуль не было дадзена.

Далей «Беларуская Крыніца» параўноўвае свята нацыянальнае з рэлігійным:

Але дзень 25 сакавіка прыпадае на дзень хрысьціянскага сьвята — Благавешчаньня. 25 сакавіка 1928 гадоў таму назад пала слова, якое сталася целам. У гэты дзень разышлася добрая весьць, што весьціла новую эру, новыя часы для цэлай людзкасьці, часы новага сьвятла — справядлівасьці і праўды.

25 сакавіка 10 год таму назад таксама пала слова, слова добрай весьці, што весьціла для беларускага народу новыя, сьветлыя, шчасныя часы ў яго гісторыі…

І хоць слова гэта яшчэ ня сталася целам, сьвяткуйма дзень нашага народнага Дабравешчаньня!

Бо чым ёсьць сьвяткаваньне?

Сьвяткуючы, мы пасьвячаем нейкі дзень нечаму, што нам дорага, што мы высока славім, да чаго маем у сэрцы нашым асаблівую чэсьць.

Сьвяткуючы дзень 25 сакавіка, мы пасьвячаем яго нашаму незалежніцкаму ідэалу, падтрымоўваем чэсьць гэтага ідэалу, спаўненьня якога чакаем

29. Вя Рагуля, удзельнік тых, каторыя таму крытыкавала «Маланка», аднак, атрымаў 2 гады турмы // Праваслаўная Беларусь. 1928. 24 сакавіка.

У наступным нумары на першай старонцы газета змясціла падрабязнае апісанне мінулага святкавання:

Пунктуальна ў часе раней азначаным урачыстае набажэнства. Прысутных траха што не поўны касьцёл. Відны паміж імі прадстаўнікі ўсіх беларускіх установ і палітычных кірункаў, духавенства, студзенства і школьная ды пазашкольная моладзь, а так-жа паважаныя госьці іншых народаў… Настрой урачысты, паднесены! Хор пад кіраўніцтвам А. Стэповіча ўдалым выкананьнем літургічных сьпеваў і рэлігійных беларускіх кампазыцыяў — выяўляе яшчэ сільнейшы тон радасьці і ўталяе расхваляваную ў сумнай прадвыбарчай гарачцы душу. Годнае асаблівай увагі выступленьне салісткі — Карузянкі.

На амвоне нядаўна вярнуўшыся з Рыму кс. Чарняўскі, каторы ў кароткіх, але ясных і гарачых словах прадстаўляе сьв. ідэал патрыёта — Хрыста. Асобныя мамэнты з жыцьця хрыстовага: навучаньне і пражываньне выключна сярод сваіх толькі радзімцаў у Палестыне, глыбокі сьлёзны сум над нявернаю сталіцаю свайго краю — Ерусалімам, трагічны канец, каторы прадбачыў сваім боскім правідам, ясны ды цьвёрды кліч: «Богу — божае, а цару (народу) — царава» — забіваюць грамаўладна фарысейскія закіды нашых ворагаў і ўцьверджаюць нас у нашых дасёляшніх, адраджэнскіх, патрыятычных імкненьнях ды змаганьнях.

Далей ішло апісанне службы, якая праходзіла ў Свята-Траецкай царкве:

Ня менш урачыстае набажэнства з падобным лікам і складам прысутных пры такім жа самым урачыстым настроі і духоўным пад'ёме. Асобную ўвагу прысутных, — рабіла акцэнт «Беларуская Крыніца», — разбуджае прамова законнага старца Іоанна адпраўляючага набажэнства. У простых, цёплых, айцоўскіх словах… паважаны моўца ўзалежняе нашыя ўсе няўдачы ад заняпаду ў нас веры і маральнасці ды недвузначнай (а мо гарачай) сымпатыі многіх нашых дзеячоў да камунізму.

У шэсць гадзін вечара святкаванне перамясцілася ў зал Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, дзе сабраліся як беларускія дзеячы, гэтак і запрошаныя прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. «З душой абагрэтай ды узмацованай, — канчала свой артыкул «Беларуская Крыніца», — рассталіся мы з гэным сьвятым, вялікім днём»[31].

24 сакавіка 1929 года традыцыйную акадэмію з нагоды 11-й гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларусі правёў Беларускі нацыянальны камітэт. Урачыстае паседжанне адкрыў сенатар Вячаслаў Багдановіч. Пасля яго выступленні пасол Сейма Альбін Стэповіч прачытаў рэферат пад назвай «Палітычнае становішча беларускага народу ў сучасным моманце». Павіншавалі беларусаў са святам літоўскія і ўкраінскія студэнты: ад імя Часовага Літоўскага камітэта выступіў яго старшыня Сташыс. Ад імя палякаў выказаўся асістэнт Віленскага ўніверсітэту Свяневіч. Акадэмія завершылася канцэртам, на якім прысутнічала каля 150 чалавек.

[31] Biełaruskaja Kniha. 1928. 25 сакавіка.

Асобная акадэмія была зладжана на наступны дзень у будынку Віленскай беларускай гімназіі. У прысутнасці каля 100 чалавек, пераважна гімназістаў, з дакладам выступіў Антон Луцкевіч, які да таго часу ўжо адмовіўся ад сваіх ранейшых сімаптыяў да БССР[32].

[32] Sprawy Narodowościowe. 1929. № 2. S. 272–273.

Газета «На варце» ў сакавіку 1930 года гэтак адкаментавала чарговыя ўгодкі:

25.III. г.г. беларускія буржуазныя паны Луцкевічы-Асіпоўскія з вялікай помпай ладзяць абход, названы імі 12-мі ўгодкамі абвяшчэньня «Незалежнасьці Беларускай Рэспублікі». Паны фашысты адпраўляюць аж тры набажэнствы ў трох розных царквах і «акадэміі»[33].

[33] Нацыянальны пераможца // На варце. 1930. 1 красавіка. С. 3.

Нягледзячы на спробы камуністаў скампраметаваць ідэю святкавання 25 сакавіка, гэтае свята працягвалі ў Вільні адзначаць. Напрыклад, на святкаванні 25 сакавіка 1930 года, якое адбывалася ў Купецкай зале па вуліцы Міцкевіча, прысутнічала каля 600 чалавек, сярод якіх было таксама багата

літоўцаў і палякаў[34].

28 сакавіка.

[34] Беларуская Крыніца. 1930. № 4.

Беларусы, — звярталася «Беларуская Крыніца» да сваіх чытачоў вясной 1932 года, — *прыбліжаецца дзень 25-га сакавіка — 14-я ўгодкі Абвяшчэньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.*

У гэты дзень кожны Беларус(ка) у думках сваіх павінен затрымацца над тым, што значыць для чалавека, для Народу ягоная культуральная, гаспадарчая і палітычная незалежнасьць, у каторай чалавецтва бачыла і бачыць свой найвышэйшы на зямлі ідэал. Гісторыя змаганьняў за гэту незалежнасьць сьведчыць, як ішлі за яе і ідуць на аўтар найцаньнейшыя ахвяры датуль, пакуль яна ня будзе здабыта.

Зварот, які, дарэчы, у адрозненне ад папярэдніх гадоў, хоць і быў змешчаны на першай старонцы, займаў усяго толькі сціплы куточак, скончваўся заклікам: «Праўда перамагчы мусіць!»[35]

Ужо ў наступным нумары газета адвяла ўсю першую паласу дню святкаваньня 25 сакавіка. У чарговы раз перакавалі гісторыю станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці і апошніх год, а таксама ўзгадаўшы пра смерць старшыні БНР П. Крачэўскага і далейшую дзейнасць на гэтай ніве В. Захаркі, «Беларуская Крыніца» рабіла выснову:

[35] Беларуская Крыніца. 1932. 20 сакавіка.

Такім чынам, як бачым, акту 25.III.1918 года ня толькі не было суджана зьдзейсьніцца, але нават было яму суджана ня мець належнай абароны з боку беларускіх міністраў, з якіх у рэзультаце замест стойка трываць пад сцягам незалежніцкім і самастойніцкім адны пашлі на супрацоўніцтва з палякамі, а другія — з бальшавікамі.

Аднак, ня ўсе і не заўсёды сыны Беларусі ломяцца пад цяжарам палітычных варункаў. Былі і ёсьць няўхільныя барацьбіты за найвышэйшы народны ідэал. Дзякуючы ім, як тут пад Польшчай, так нават і там у Беларусі Савецкай ідэал Незалежнасьці Беларусі, ідэал поўнай самастойнасьці і шчасьця Беларускага Народу, ідэал абвешчаны ўрачыста 14 гадоў таму 25.III.1918

году, астаецца ўсьцяж жывым ды ўсьцяж ярчэйшымі сьвеціць краскамі. А калі Ідэал гэты наш вялікі жыве ў народзе і паглыбляецца ў народнай душы, гэта знак, што ў сваім часе ён зьдзейсьніцца

[36].

Побач газета надрукавала верш, які гэтак і называўся — «На 25-га сакавіка». Апошнія радкі яго гучалі наступным чынам:

[36] Беларуская Крыніца. 1932. 27 сакавіка.

Устань, устань!
Скарэй, скарэй!!
Раўняйся да другіх людзей.
На сонца глянь.
Крылом удар —
Пазнай свабоды, волі чар!»

У сувязі з супадзеннем 14-х угодак дня Незалежнасці і каталіцкага Вялікадня, агульны сход Віленскага БНК вырашыў абмежавацца святочным паседжаннем камітэта. Пасля кароткай «адпаведнай да ўрачыстасьці» прамовы Я. Пазняка, была прынята рэзалюцыя з заклікам «стаяць і на далей у цьвёрдай веры і пераканаьні, што права да жыцьця для жывога Народу пачутым і прызнаным быць мусіць».

«Беларуская Крыніца» змясціла кароткія зацемкі аб святкаванні дня незалежнасці рознымі беларускімі асяродкамі, у тым ліку — і ідэйнымі праціўнікам хадэкаў.

Сьвяткавала гэтае вялікае народнае сьвята, — пісала газета ў артыкуле «Сьвяткаваньне ў Віленскім засьценку беларускіх угадоўцаў», — сьвята незалежнасьці Беларускага Народу і мяшчанская групка віленскіх беларускіх угадоўцаў, якая называе свой кагалік «Цэнтрасаюзам». Гэная групка, за сваю ўгадовасьць маючы падтрыманьне ў сільных сяньняшніх дзён, ня маючы за гэта ніякіх уплываў на беларускія масы і ніякага адтуль падтрыманьня, мае «магчымасьць» уступіць і ў Віленскую беларускую гімназію.

Вось-жа і ў гэты Вялікі дзень для беларусаў «нашы» ўгадоўцы скарысталі з гэтай «магчымасці» і наладзілі паседжаньне «Цэнтрасаюзу» ў гімназіяльнай залі, дзе прад сагнанымі вучнямі прачытаў свой палітычны рэфэрат «Ідэолёг» найнавейшай санацыйнай беларуска-польскай угоды — «Бялорусін-поляк» Антоні Луцкевіч

[37].

Асабліва актыўна беларускім грамадзянствам Вільні[37] адзначаліся 15-я ўгодкі абвяшчэння незалежнасці БНР, больш, што ў той год яны супалі з юбілеямі паўстання 1863 г. і Кастуся Каліноўскага. Ранкам 25 сакавіка адбылася традыцыйная імша ў касцёле св. Мікалая, якую, як звычайна, правіў кс. Ад. Станкевіч. Праваслаўныя сабраліся на малітву ў Прачысценскім саборы. Віленскі праваслаўны ўладыка Феадосій забараніў праваслаўным святарам прымаць удзел у святкаванні 25 сакавіка, матывуючы забарону тым, што мерапрыемства мае яскравы антыпольскі характар.

[37] Беларуская Крыніца 1863. 1932. 10 сакавіка.

А 8-й гадзіне вечара пачалася ўрачыстая акадэмія. Зала Віленскай літоўскай гімназіі, дзе сабраліся яе ўдзельнікі, была аздоблена партрэтам Кастуся Каліноўскага і выявай Пагоні, створанымі пэндзлем Пётры Сергіевіча. Асноўную частку акадэміі склалі два рэфераты. Першы, пад назвай «Незалежнасць Беларусі як ідэал — задаткам незалежнасці фактычнай», прачытаў студэнт С. Сарока. З другім, прысвечаным Кастусю Каліноўскаму, на працягу дзвюх гадзін выступаў кс. Ад. Станкевіч[38]:

Тое ўсё, чаго сваёй працай агулам, а прадусім «Мужыцкай Праўдай», а так-жа і сьмерцяй сваёй даканаў К.Каліноўскі для беларускага народу семдзесят гадоў таму, змагаючыся за ідэал і долю гэтага народу, — акт абвешчаньня незалежнасьці Беларусі 25.III.18 падабраў, згарнуў у цэласьць, прыкрасіў, дапоўніў і выразіў як яўную — ужо сучасную — волю беларускага народу да вольнага і самастойнага жыцця. Словам, зярнё, якое на беларускай грамадска-палітычнай ніве пасеяў Каліноўскі, акт 25.III.18 зжаў, карыстаючыся пладом гэнага зярняці для сяўбы далейшай[39].

[38] Беларуская Крыніца 1933. №14.

Разам з своеасаблівай міфалагізацыяй 25 сакавіка работнікі спробы больш крытычна прааналізаваць прычыны таго, чаму беларуская незалежнасць так і не сталася фактам. Газета «Родны Край» пісала:

Сягоньня — 25 сакавіка — мінае 15 гадоў ад таго гістарычнага мамэнту, калі Рада Беларускае Народнае Рэспублікі ў Менску абвясьціла парванымі ўсе старыя дзяржаўныя сувязі Беларусі, якія далі магчымасьць маскоўскім царам кінуць наш народ у полымя страшэннае вайны, у выніку якое новая — бальшавіцкая — улада Расеі пры падпісаньні Берасьцейскага міру з Нямеччынай ганебна таргавала Беларускай зямлёй і рэзала жывое цела нашага народу на часткі. 25 сакавіка 1918 году правамочныя прадстаўнікі ўсяе Беларусі — адзінае й непадзельнае — абвясьцілі сваю Бацькаўшчыну вольнай і незалежнай Рэспублікай.

Далейшы ход выпадкаў ня даў акрэпнуць маладой Беларускай дзяржаве. Рана, зробленая Берасьцейскім мірам, не загаілася. Наадварот: польска-расейская ўгода ў Рызе паглыбіла гэту рану, і яна крывавіць і сягоньня, а сыны нашага народу ня могуць падаць сабе рукі праз праведзены на нашай зямлі гранічны кардон. Але акт 25 сакавіка 1918 году, хоць не зрэалізаваны палітычна, стаўся несьмяротным у свядомасьці Беларускага народу, які ў гэтым акце выявіў сваё нацыянальнае адзінства і крэпкую волю быць гаспадаром на сваёй зямлі.

Але,

— дадавала газета, — *зварачаючыся думкай да вялікага дня 25 сакавіка 1918 года, мы мусім сягоньня сьцьвердзіць, што ня толькі вонкавыя прычыны перашкодзілі пятнаццаць гадоў назад зрэалізаваць наш нацыянальны ідэал. Была яшчэ і адна прычына ўнутранага характару: слабасьць нашае нацыянальнае культуры. Народ наш, нашая інтэлігенцыя тады толькі-толькі пачала выбівацца з культурнае няволі ў суседніх народаў, якая пазбаўляла нас таго, што зьяўляецца першай падставай дзеля дзяржаўнага існаваньня кожнага народу; самапэўнасьці. Усьцяж мы аглядаліся на суседзяў, усьцяж чакалі нейкага ратунку ад другіх і ня мелі адвагі пачаць жыць сваім уласным розумам.*

39 Stackievič, Ad. Kastuś Kalinouski, «Mużyckaja Prauda» i ideja Niezależnasci Biełarusi. Wilna, 1933. S.15—6.

Такую самапэўнасьць, без якое наш народ ня станецца запраўды незалежным, а вечна будзе нейкім папіхачом у чужынцаў, даць нам можа толькі высокая нацыянальная культура. Беларускі палітычны рух, які пачаў разьвівацца ад 1918 году нязвычайна шпаркім ходам, пакінуў далёка за сабой рух культурны — прынамся ў нашай Заходняй Беларусі. І перад намі стаіць сяньня вялізарнае заданьне: будаваць сваю нацыянальную культуру, давясьці наш культурны рух да такога-ж буйнага росту й разгону, якія мы бачылі ў палітычным руху.

Ведама, гэтае заданьне шмат цяжэйшае, чым тая ці іншая палітычная акцыя. І гэтым толькі й можна вытлумачыць факт страшэннага адставаньня культурнага руху ў Заходняй Беларусі ад руху палітычнага. Але мы мусім зраўняць тэмпы тут і там за ўсякую цану. Мы мусім напружыць нашу волю й нашу энэргію, каб стацца моцнымі на культурным фронце. І сяньня, у пятнаццатыя ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі, мы мусім сабе добра ўсьвядоміць, што будаваньне нашае нацыянальнае культуры гэта ёсьць адначасна закладаньне наймацнейшага фундамэнту пад той Беларускі Дом, у якім наш народ — раней ці пазней — будзе жыць вольным і незалежным жыцьцём.

Артыкул канчаўся заклікам: *«Будуйма сваю культуру, і мы збудуем сваю дзяржаву!»*[40]

Перадавы артыкул у «Беларускай Крыніцы» на 16-я ўгодкі Незалежнасці БНР пачынаўся так:

[40] Родны край. 1933. 25 сакавіка.

Сьмерці няма — кажуць філёзафы, — а ёсьць вечнае жыцьцё і вечны развой і поступ. Пацьверджаньнем гэтай праўды ў нас зьяўляецца між іншым так жа і акт 25.III., акт абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі 16 гадоў таму. І сапраўды, акт гэты, які на супроць розных цёмных магутных сілаў, скіраваных проціў Беларускага Народу, выявіў няўхільную волю этага народу жыць і разьвівацца і жыць поўным, самастойным жыцьцём, сьведча дастатачна, што сьмерць — гэта толькі ўраеньне, што сьветам валадарыць непакананае жыцьцё і яго таёмныя правы[41].

Побач змяшчалася літаратурная алегорыя пад назвай

[41]

«Беларускае народнае свята»: Беларуская Крыніца. 1932. 25 сакавіка. № 14. С. 1.

Гэта быў дзень 25 сакавіка 1918 года, — пачыналася яна, — над Беларусьсю тады яскрава гарэла заўсёды добрае сонца. Так раніцай яно пламянае радасна ўсходзіла над Смаленскам, што раз вышэй бодра ішло ў гару па небе і ў палудню ўжо сьмяючыся глядзела на … Менск. Папалудні-ж узноў, звярнушыся на Захад, яно чырвонае пакаціласа далёка, далёка аж за Беласток[42].

Дзень 25 сакавіка, — пісала «Беларускай Крыніца» аб Тамсама. святкаванні Дня незалежнасці ў наступным нумары, — *беларускае грамадзянства з году ў год сьвяткуе з вялікай урачыстасьцю. У гэты дзень усе беларускія народныя сілы заўсёды злучае адна супольная ідэя беларускага народу — ідэя Акту 25 сакавіка 1918 году. Беларускае незалежнае грамадзянства Заходняй Беларусі, аб'яднанае пад бел-чырвона-белым сьцягам Беларускага Нацыянальнага Камітэту, 16-я угодкі Абвяшчэньня Незалежнасьці Беларусі сьвяткавала ў Вільні ў наступным парадку…*

Далей падаваўся кароткі агляд таго, як адзначалася гэтая падзея віленскімі беларусамі. У касцёле св. Мікалая адправіў святочную імшу кс. А. Станкевіч. Пасля выступіў кс. Глякоўскі з казаннем, якое «сваім глыбокім зьместам зачапіла слухачоў». Трохі пазней — а дванаццатай гадзіне, прайшоў святочны малебен у Святадухаўскім саборы, праведзены ахімандрытам Ф. Марозавым. «Пры гэтым, — дадавала газета, палічыўшы дадзены факт за вельмі істотны, — трэба адзначыць, што архіепіскап Хвядос сам асабіста прад сябрамі Праваслаўнай Камісіі Беларускага Нацыянальнага Камітэту загадзя абазначыў сабор сьв. Духа месцам для набажэнства ў дзень беларускага народнага сьвята».

На святочным паседжанні ў залі БІГіКу быў прачытаны рэферат кс. В. Гадлеўскага — «З беларускага палітычнага жыцьця ў Менску ў 1917—1918 гадох», прагучалі шматлікія віншаванні ад імя прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Пасля вусных прывітанняў А.Клімовіч прачытаў шэраг святочных віншаванняў[43].

Крызіс беларускага руху справакаваў з'яўленне сілаў, якія спрабавалі здабыць сабе капітал на міфалагізацыі нацыянальнага супраціву ў БССР. Гэтак газета «Беларускі Працы» з нагоды свята змясціла зацемку пад назвай «25 сакавіка ва Усходняй Беларусі»:

Беларуская Нацыяналістычная Грамада на некалькі дзён перад 25 сакавіком распашырала па ўсёй Усх. Беларусі адпаведныя адозвы, а таксама вяла і адумысную акцыю, заклікаючы беларускае грамадзянства да ладжаньня сьвяткаваньняў з нагоды 16-ых угодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі. У ноч з 24 на 25 сакавіка ў шмат якіх мясцовасьцях былі павывешываны бел-чырвона-белыя сьцягі і параскіданы процімаскоўскія, белнацыяналістычныя адозвы. У самы дзень 25 сакавіка шмат дзе адбыліся заканспіраванья акадэміі. Некаторыя з іх былі выкрыты агэнтамі ГПУ (падслуцкія лясы, Менск), у выніку чаго адбыліся масавыя арышты, а нават і расстрэлы. Адна з вайсковых частак, адмовіўшаяся страляць у выкрытых маніфэстантаў, быццам у той жа дзень была перакінута ў глыб Маскоўшчыны[44].

Дыяметральна процілеглымі былі публікацыі ў пракамуністычнай гумарыстычнай газеце «Асва», якая ў тыя ж сакавіку 1934 года надрукавала вершаваны пасквіль «Краса Б.Н.Р.» ілюстраваны ў выглядзе комікса матэрыял «Эпапэя пра Б.Н.Р.» Вось некалькі вытрымак:

БНР — як сімвал улады
Цешыць душы ўсіх паноў,
Беларускай панскай РАДЫ,
Што смактала з люду кроў…

…БНР — узрос над касьцямі
І пад людзкі плач і стогн,
Генэральскімі штыкамі…
Нёс кайданаў гулкі звон…

Ці гэтак:

[42] Крушыніца А. 25 сакавіка. № 16. С. 1.

[44] Беларусь нараўтыпэ. 1934. 28 сак. С. 3.

Разам з сотнямі Вільгельма
Пруць разогнаныя шэльмы.
У Менску гоман, у Менску шмэр
Абвясцілі незалежнасьць — Б.Н.Р.[45]

Наступны нумар «Асвы» адчыняў артыкул пад красамоўным загалоўкам: «Стаіцё вы голыя, як турэцкія сьвятыя» аб святкаванні дня Незалежнасці.

[45] Асва. 1934. 25 сакавіка.

Так, — пісаў аўтар, схаваўшыся за псеўданімам Зьмітрук Быліна, — *працоўныя Заходняй Беларусі разам з сваімі братамі, паказалі вас паночкі, зьдзёршы шматгадовую маску і стаіцё вы сёньня, голыя, як турэцкія сьвятыя з усёю сваёю беларускабуржуазнаю цудоўнасьцю. Ад лаянак, адзін на аднаго, пачынаеце пераходзіць да цёплых гутарак:*

— Нас толькі двое,
— Абое мы рабое, —
Хоць розным быў наш шлях;
Адзін будуем гмах:
На ім дэвіз пагоні
І жыцьця нашы гоні
Вядуць у тую дзьвер,
Дзе зорка — Б.Н.Р.
Работнікі і працоўны селянін з вашага сьвята робіць свой вывад:
— Яны кажуць, што на сьвята,
Хапіла нашага ім брата,
Што салі поўныя былі
Незалежнасьцю цьвілі
У вас ня была люду працы,
Пір вялі «дварцы», палацы
Там Астроўскі і Луцкевіч
Кс. Гадлеўскі і Станкевіч
Праглядалі здрады шлях,
«Дзе з аружжам у руках
Мужна білісь за ідэі».
Тут сабраліс ліхадзеі,
Чорнай зграі круганы
Беларускія паны[46].

Крызіс беларускага нацыяналізму ў Заходняй Беларусі можна лёгка заўважыць ужо ў загалоўках артыкулаў. Перадавіца юбілейнага артыкула 1936 года ў «Беларускай Крыніцы», напрыклад, называлася — «Ці ідэал акту 25.III.1918 ідзе да сваёй мэты?»[47]

І ўсё ж такі тая самая «Беларуская Крыніца» абавязкова вярталася да абмеркавання гэтай падзеі. Ужо ў наступным, пятнаццатым нумары, яна друкуе артыкул з лаканічнай назваю: «25 сакавіка 1918—1936»:

З кожным годам аж да сягоньня, акт 25 сакавіка ў беларускім народзе мацнеў і шораз глыбей клаўся ў душу беларускую. Калі гэны 25 сакавік не здолеў тады ахапіць шырэйшых мас беларускай гушчы так, каб беларусы самі абаранілі сваю самастойнасьць, то факт фактам астаўся, што 25 сакавік запаліўшыся ня згас, і патаптаны — жыцьця свайго не адрокся. Праз 18 гадоў мы даведаліся, што сіла 25 сакавіка робіцца маторнай сілай усяго беларускага жыцьця і што раз выразьней яна апановывае ўвесь беларускі народ. Гэны 25 сакавік, — найнавейшы твор беларускага духа, усяго беларускага народу. За 18 гадоў мы ужо пасьпелі акуратна зразумець яго, усебакова разглядзець і ацаніць магутнасьць беларускага народу, што так заўсёды рвецца да самастойнага жыцьця. Мы не пакінем ніколі гэнага 25 сакавіка. Ён будзе нашай зоркаю як на цёмным, так і на сьветлым гарызонце нашага жыцьця[48].

Перадапошнія перад пачаткам новай вялікай вайны, 18-я ўгодкі абвяшчэння Незалежнасці БНР адрозніваліся ад папярэдніх святкаванняў, прычым, у горшы бок: калі набажэнствы ў касцёле і царкве адбыліся, адбылася нават святочная вечарына ў былой беларускай гімназіі, а цяпер — філіі польскай дзяржаўнай гімназіі ім. Ю. Славацкага, дык акадэмія Віленскага БНК была забаронена.

Дарэчы, гэтае святкаванне было адзначана даволі цікавай інавацыяй. У 20.30 пачалася трансляцыя радыёперадачы з тагачаснай сталіцы Літвы, Коўна, падчас якой з прамовамі выступілі лідэры беларускай супольнасці Літвы, а пасля прагучала выступленне беларускага хора[49].

[46] Асва. 1934. 25 красавіка.
[47] Беларуская Крыніца. 1936. 22 сакавіка.
[48] Беларуская Крыніца. 1936. 29 сакавіка. С. 2.

У сярэдзіне 1930-х гг. традыцыя святкавання ўгодкаў абвяшчэння незалежнасці БНР выйшла за межы Вільні, найперш у асяродкі, што знаходзіліся пад уплывам БХД. Цэнтрам гэтым факталагічны змест падзеяў 25 сакавіка 1918 года ўсё больш і больш забываўся. У пачатку сакавіка 1935 г. старшыня гуртка БІГіКа ў мястэчку Жодзішкі Андрэй Цікота пісаў кс. В. Гадлеўскаму:

Збліжаецца Беларускае народнае сьвята ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі ў Менску ў дзень 25 сакавіка. Хачу, каб і наш гурток адсьвяткаваў як належа гэтае вялікае сьвята. Хачу, каб ў нашым гуртку ў дзень 25 сакавіка была прачытана лекцыя з гісторыі, зьвязаная з падзеямі абвяшчэньня гэтай незалежнасьці. У зьвязку з гэтым прашу выслаць мне рэфэрат з гісторыі абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі. Пастараюся ў дзень 25 сакавіка ў гуртку яго прачытаць[50].

25 сакавіка паступова прыходзіла ў сцены дамоў-чытальняў і вясковых бібліятэк. Напрыклад, 25 сакавіка 1934 года святкавалі ў Ашмянах, Смаргоні і вёсцы Шутавічы. Сябры шутавіцкага гуртка Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры 25 сакавіка 1934 года вывесілі пасярод сваёй вёскі бел-чырвона-белы сцяг, які праз некалькі гадзін быў зняты польскімі паліцыянтамі. Гурткоўцы не хавалі свайго ўчынку і нават звярнуліся да ашмянскага старасты з патрабаваннем вярнуць ім сцяг, паколькі той «зьяўляецца ўласнасьцю гуртка» а ўчынак паліцыі знаходзіцца ў супярэчнасці з патрыятычным пачуццём беларусаў[51].

Польская адміністрацыя ўспрымала святкаванне 25 сакавіка як акцыю антыдзяржаўнага характару і старалася ўсякімі спосабамі перашкаджаць пашырэнню гэтай традыцыі па-за межы Вільні. Так, павятовы камендант паліцыі ў Ашмянах Леановіч напярэдадні святкавання дня незалежнасці ў 1936 годзе паведамляў ва ўсе мясцовыя пастарункі:

25 сакавіка прыпадае гадавіна аб'яўлення Незалежнасці Беларусі ў 1918 г. Трэба лічыцца з тым, што дзеячы гэтага кірунку (беларускія хрысціянскія дэмакраты — аўт.) *будуць старацца выкарыстаць гэтую гадавіну для маніфестацыі сваіх імкненняў да незалежнасці.*

[49] Беларуская ВХД. Цэнтр. 1936. 5 старонка.

[50] НАРБ. Ф. 880. Воп. 1. Спр. 15. Арк. 147.

[51] НАРБ. Ф. 880. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 3–4.

Да спробаў арганізаваць святкаванне 25 сакавіка камендант загадваў ставіцца наступным чынам:

публічныя сходы, як пад адкрытым небам, так і ў памяшканнях, забаронены, затое, калі б асобныя беларускія арганізацыі (гэта можа быць гурток Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры ў Шутавічах), намерваліся зрабіць сход сваіх сяброў, то не належыць ім чыніць у гэтым накірунку асаблівых перашкод. Належыць, аднак, у гэтым выпадку выкарыстаць шырока права згодна з пунктамі 2 і 3 артыкула 20 закону аб сходах, якія сцвярджаюць, што ў выпадку атрымання весткі, што сход пераходзіць рамкі, акрэсленыя ў арт. 18, або калі ў сходзе прымаюць удзел апрача сяброў гэтага таварыства яшчэ іншыя асобы, органы грамадскай бяспекі могуць з мэтай праверкі гэтай акалічнасці ўвайсці ў памяшканне, дзе адбываецца сход, і ў выпадку пацвярджэння такога перавышэння, зборышча належыць распусціць[52].

Узмацненне паліцэйскага рэжыму міжваеннай Польшчы прывяло пад канец 1930-х гадоў да амаль поўнай ліквідацыі ўсіх беларускіх нацыянальных структур у Заходняй Беларусі. Будучы дзе ў фактычным, а дзе ў юрыдычным падполлі, беларускія дзеячы ўсё часцей успрымалі 25 сакавіка як магчымасць калектыўна прадэманстраваць сваё памкненне да незалежнасці. Нават напамін пра 25 сакавіка станавіўся для польскай адміністрацыі зачэпкай для рэпрэсіяў. У студзені 1938 года за згадку ў сваім Статуце аб Акце 25 сакавіка быў зачынены польскімі ўладамі Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні, арганізацыя, якая амаль дваццаць гадоў гуртавала віленскія беларускія суполкі, редакцыі, таварыствы. Ужо толькі ўспамін аб дні абвяшчэння незалежнасці ў газеце польскія цэнзары трактавалі як спробу парушыць тэрытарыяльную цэласнасць. Як запісаў у сваім дзённіку ў студзені 1938 г. кс. А. Станкевіч:

Сканфіскаваны № 1 «Шляху Моладзі» за артыкул, у якім успамінаецца, што беларуская моладзь і далей будзе помніць / даслоўна/ аб 25.III.18. Вось жа за гэта сканфіскаваны гэны

[52] Памяць. Смаргонскі раён. Мінск: Беларусь, 2004. С. 181.

артыкул. Рэдактару Я. Найдзюку сказалі ў ваяводстве, што аб гэтым пісаць ня можна: даўней можна было, а цяпер — не, бо зьмяніліся часы, бо акт 25.III. успамінае як аб беларускіх этнаграфічных землях, аб Горадзеншчыне і аб Віленшчыне. Бедны акт 25.III.1918![53].

25 сакавіка 1939 года, калі ў Вільні ўжо не было кс. Ад. Станкевіча (быў высланы ў Слонім), урачыстую імшу ў касьцёле св. Мікалая правялі два ксяндзы-літоўцы, блізкія сябры Ад. Станкевіча, К. Чыбірас і В. Ташкунас.

Напярэдадні Другой сусветнай вайны, 25 сакавіка, калі на спробы і польскай адміністрацыі, і камуністычнай прапаганды забараніць ці ўсяляк ачарніць яго, ператварылася ў дзень агульнанацыянальнай салідарнасці беларусаў. Святкаванне гэтага дня ператварылася ў матэрыяльнае ўвасабленне беларускай нацыянальнай ідэі, і, адначасова, фактычна — у рухавік, аб'ектыўны фактар яе далейшага развіцця.

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

№ 1-2 (64-65) 2008

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2008/06/18**

[image]

[53] Ад. Станкевіч, Бедны Адама Каляндарныя нататкі // Куфэрак Віленшчыны. 2004. № 1(9). С. 153.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2008/06/18
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2008/07/19
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2008 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2008/07/19
[image]